Новы Час | 27 сакавіка 2020 | № 12 (671) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №3

Літаратурная Беларусь

Выпуск №3 (163)
(сакавік)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест

Вялікі дзень



За свабоду сваю...

Янка КУПАЛА

За свабоду сваю
Ўсёй душой пастаю;
У агонь, у ваду
Я за ёю пайду.

Лепей сам сябе дам
Пахаваці людзям,
Як свабоду хаваць,
Злыбядзе аддаваць.

У сэрцы, ў думках сваіх
З самых лет маладых
Я яе ўзгадаваў
І сваёю назваў...

Гэй ты, гэй, вецер, пей
Аб свабодзе маей!
Гэй ты, гэй, бор, шумі,
Аб свабодзе грымі!

Гэй ты, сонца, гары
Ад зары да зары,
Ланцугі распалі
Па ўсёй чыста зямлі!..

1911

25 Сакавіка

Алесь ЗМАГАР

Радзіўся Ты — у Менску Беларускім,
Пажарам Край дыміўся у вагні.
Наўкол чужынцы на палетках вузкіх
Тапталі скарбы нашых родных ніў.

Народ стагнаў, угору ўздымаў рукі,
Лавіў святла недасяжны прамень.
Быў цяжкі час. Сярод нясцерпнай мукі
З'явіўся Ты, прыгожы, светлы Дзень.

Цудоўнай зоркай ўзняўшыся высока,
Народу шлях да волі асвяціў,
І зашасцелі казкаю асокі,
Мінулай славай лес загаманіў.

І Край ажыў. Народ паймкнуўся к свету,
Ў вачах крынічыць радасці струмень.
І нашых продкаў слаўны запаветы
Ўваскрослі ў гэты незабытны дзень.

Вялікі Дзень! Нічым Цябе не сцерці!
Стагоддзям нат Цябе не пераждыць!
Вякі мінуць, а Ты ў народным сэрцы
У песнях, былях будзеш жыць!

Кіргхайм — Аўстрыя, 25 Сакавіка 1946

25 Сакавіка

Рыгор БАРАДУЛІН

Дваццаць пятага сакавіка —
Годны дзень
Беларускай дзяржавы.
Веснаплынных вятроў талака
Пыл з кароны атрэсла іржавы.
Шматавалі нас досыць арлы
І з адной, і з дзвюма галавамі.
Мы не з нейкай бязроднай імглы,
Нас вякі як сваіх
Гадавалі.
Мы — ратаі святла,
Крывічы,
Верхачы неўміруючай Пагоні.
Маладзік сакалом на плячы,
Гартны меч у цвярдое далоні.
Лучыць нашыя мары рака
Бел-чырвона-белага сцяга.
Дваццаць пятага сакавіка —
Наша свята,
Пароль
І прысяга!

Дзень Волі

Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

І
У камеры турэмнай, нібы звер,
Глухім адчаем выючы да столі,
Святкую я стагоддзе БНР —
няспраўджанае свята нашай Волі.

Прынік да вочка
Вокам
вартаўнік.
Мардаты. Зубы сцяты. Чын па чыну.
А недзе там, над столлю, — сакавік.
І недзе там — за кратамі — Айчына.

І раптам я адчуў, што мы ўдваіх
За кратамі, як з ланцугом на шыі,
Я выю ў столь па гэты бок ад іх,
Яна — па той бок у нябёсы вые.

Аж дрыжыкі бяруць з яе выцця!
Такая ў ім туга, нуда такая.
Як не хапае ёй, каб жыць, жыцця,
І смерці, каб памерці, не хапае!
І так — скрозь век, скрозь сто
студзёных год,
Скрозь боль і жах, скрозь песні
з карагодамі —
І скрозь правадыроў, і скрозь народ,
Які ніяк не можа стаць народам.

II
Вясна, вясна! Скажы, шапні ты мне,
Калі ўжо ты прыйшла на наш гасцінец,
Чаму я ў роднай, крэўнай старане
Турме — радня, а ўсёй радні —
чужынец?

Шапні, вясна чаканая, скажы:
У чым я прад Айчынай вінаваты?..

І слухаў я, як б'юцца капяжы
Аб падваконнік,
Аб сцяну,
Аб краты...

III
О, Беларусь! О, Крывія мая!
Ты
Ува мне
Жывой крывёй струменіш!
І гэта ўжо ніяк,
Нічым не зменіш:
Кроў на ваду не памяняю я.
Дарма — турма! А Воля — не дарма!
І не дарма Пагоні меч узняты!
Мы рассячэм ланцуг!
Мы вырвемся з ярма!
Мы ўсё-ткі спраўдзім
Волі нашай
Свята!

25 сакавіка

Уладзімір АРЛОЎ

У краіне,
на вуліцах якой
ідзе паляванне
на паэтаў
і проста на людзей,
што гавораць на мове
сваіх продкаў,
пачынаеш асабліва цаніць
смак віна
і свежага хлеба,
талент жаночых вуснаў
і тое, што сёння
зноў удалося
своечасова прыйсці
на спатканне.



Лаўцы́ аблокаў (верш з шуфляды)

Анатоль ІВАШЧАНКА

Адрасаваныя сцягі
чакаюць Свята
у шуфлядах.
Сыходзяць чэзлыя снягі
шумлівым вадаспадам.
На Панікоўку крумкачы
з Кальварыі
на кліч шалёны
зляцеліся сярод начы.
Не спіцца Завулону!..
Над Пляцам сёння «рыбакі»
закінуць у аблокі вуды.
Адрасаваныя сцягі —
прадвесце цуду.

25.03.2011

«Смерці няма» — Рыгор Барадулін

Глухому не раскажаш, як пяе салоўка, сляпому не пакажаш, як узыходзіць над салаўіным спевам сонца. А духоўна глухому, духоўна сляпому ды яшчэ й бязмоўнаму не давядзеш, што Рыгор Барадулін (якому б сёлета споўнілася 85 гадоў) — гэткі самы цуд, як салаўіны спеў і ўзыход сонца...

На ўзыходзе сонца мы сталі на ўзлеску пад Каралішчавічамі і глядзелі на мураша, які бегаў па пні ўчора спілаванай сасны. Ён бег і бег кругамі па колцах дрэва, пашыраючы кругі ад стрыжня да абалоні, не падбіраючы нічога ні для сябе, ні для мурашніка — і немагчыма было вызначыць мэту гэтага бегу.

«Гады лічыць», — сказаў Барадулін.

Для яго было зусім натуральна, што мураш, бегаючы па колцах на пні спілаванага дрэва, лічыць гады, якія яно пражыло. Бо сапраўдны паэт — гэта цэласнае ўяўленне свету. Непадзельнае ў вялікім і малым, чалавечым і мурашовым — у жыцці і смерці.

«Смерці няма», — сказаў ён напрыканцы жыцця.

Калі на Бутаўскіх кладах у Вушачах хавалі ягоную маці, ён, тады яшчэ малады, адышоў ад магілы і стаў кідаць у неба сасновыя шышкі. Немагчыма было вызначыць мэту гэтага дзеяння — як бег мураша па крузе. Але на небе быў Бог. А ў зямлю апускалі маці.

Пасля ён напіша, што маці — суперніца смерці. І выдыхне вершы з выяўленнем такой любові да жанчыны, якая падаравала яму жыццё, такога жалю праз яе страту, якіх ніхто ў паэзіі да яго не выяўляў.

У фізічных высілках чалавек здольны не на шмат большае, чым мураш. Калі нават нешта закіне ў неба. А ў высілках духоўных ён можа наблізіцца да Бога.

«Паэт будуе сам сябе, як храм...» — сказана Барадуліным не ў маладосці — на схіле веку. Калі ўжо з’явілася адчуванне, што ён «адзін, як час».

Да зоркі лёсу
Пазычаным ценем
Прывязаны,
Я пасуся тут...

Хвароба, якая ў апошнія гады бязлітасна яго згрызала, адбірала рухі, адбірала рукі — не закранула дух, розум, талент. Бог не даў. Абараніў свайго абранца. І да апошняга радка, да апошняга свайго выдыху Рыгор Барадулін — светлы, ясны, высокі, пранізлівы. Паэт невераголнай сілы і красы. Найперш паэт крывіцкай мовы, чарадзей беларускага слова.

Калі яго апускалі ў зямлю, клалі побач з маці, сонца ўжо схавалася — і над кладамі, над вершалінамі соснаў хутка-хутка ўзышоў, нібы ўскрыліў, маладзік. Не выпадкова ўскрыліў: першая кніга Рыгора Барадуліна пазначаная маладзіком. Бог пра гэта не забыўся. І новенькі, толькі што адкаваны серпік маладога месяца здаваўся залатой прыступкаю, стаўшы на якую Барадулін і пайшоў ад нас. Так, як звык: пехатаю. Туды, дзе ягоная маці Куліна, ягоныя сябры Быкаў і Караткевіч: у неба.

Уладзімір Някляеў

Анталогія старагрэцкай драматургіі

Пры спрыянні Саюза беларускіх пісьменнікаў у серыі «Драматургі свету» выдавецтва Зміцера Коласа выйшла анталогія «Старагрэцкая драматургія» з перакладамі антычнай класікі, зробленымі Лявонам Баршчэўскім і Юльянам Дрэйзіным. Пераклады Юльяна Дрэйзіна 1920-х гадоў выйшлі ў абноўленай рэдакцыі Лявона Баршчэўскага.



Зборнік старагрэцкай драматургіі ўключае шэраг найбольш вядомых твораў такіх выдатных майстроў трагедыі, як Эсхіл («Персы» і «Прыкуты Праметэй»), Сафокл («Эдып-цар», «Антыгона») і Эўрыпід («Бакханкі»), а таксама камедыі — Арыстафан («Люсістрата» і «Жабы») і Менандр («Адлюднік»). Кніга змяшчае грунтоўную прадмову Алеся Жлуткі і такія ж грунтоўныя каментары да кожнага твора, падрыхтаваныя Лявонам Баршчэўскім.


У такім прадстаўнічым аб’ёме, на 460 старонках, драматургія Старажытнай Грэцыі па-беларуску выходзіць упершыню за ўсю гісторыю айчыннай перакладной літаратуры.

Наклад выдання — 99 асобнікаў.

Прэс-служба Саюза беларускіх пісьменнікаў

Паэт, святар, вязень ГУЛАГу

У сакавіку адзначаецца 130-годдзе з дня нараджэння беларускага пісьменніка, дзеяча культуры і хрысціянскага руху Язэпа Германовіча (Вінцука Адважнага).



Язэп Германовіч нарадзіўся ў мястэчку Гальшаны Ашмянскага павета Віленскай губерні (цяпер Ашмянскі раён Гродзенскай вобласці). Паходзіў з сялянскай сям’і: бацькі — Станіслаў і Ганна (з дому Савіцкіх) Германовічы. У 1898—1902 гадах наведваў Гальшанскую народную школу, а наступныя чатыры гады — Ашмянскае гарадское вучылішча. У 1913-м скончыў Віленскую духоўную каталіцкую семінарыю. 29 чэрвеня 1913 года пасвечаны ў святары, тады ж распачаў душпастырскую дзейнасць як вікарый у мясцовасці Далістова Беластоцкага павета. Пазней працаваў у розных парафіях Беластоцкага дэканата (Беласток, Крынкі, Мсцібава, Вялікая Лапеніца).

У 1921 уступіў у Таварыства беларускай школы; арганізоўваў беларускія школы, у касцёле гаварыў казанні на беларускай мове. Выступаў у беларускім перыядычным друку. Празаічныя і паэтычныя творы В. Адважнага рэгулярна з’яўляліся на старонках перыядычнага друку («Krynica», «Chryścijanskaja Dumka»). Пераследаваўся польскімі свецкімі і духоўнымі ўладамі.

З 1932 года быў на місіянерскай працы ў Харбіне (Маньчжурыя), дзе таксама быў дырэктарам гімназіі.

У 1936-м вярнуўся ў Вільню, кіраваў Беларускім марыянскім домам студэнтаў. У 1938-м дэпартаваны разам са студэнтамі ў Цэнтральную Польшчу, адкуль у хуткім часе зноў выехаў у Харбін. У 1948 годзе арыштаваны кітайскай паліцыяй і перададзены савецкім органам бяспекі. Быў прысуджаны да 25 гадоў прымусовых работ у лагерах. Знаходзіўся ў зняволенні ў Сібіры. Пасля смерці Сталіна вызвалены.

Выехаў у Польшчу, пад канец 1959 года — у Рым, а неўзабаве прыбыў у лонданскі Дом Марыянаў. Прымаў удзел у рэлігійным і культурным жыцці беларускага замежжа. Рэдагаваў часопіс «Божым шляхам» (Лондан). Пра свае знаходжанне ў лагерах напісаў успаміны «Кітай — Сібір — Масква», якія выклікалі вялікую цікавасць, былі апублікаваныя на беларускай, італьянскай, польскай, літоўскай мовах.

Памёр у Лондане 26 снежня 1976 года.

Новы музей Караткевіча

Прапанову аб стварэнні музея Уладзіміра Караткевіча ў доме, дзе пісьменнік жыў і працаваў над сваімі творамі, калі прыязджаў у госці да дзядзькі, выказаў дырэктар рагачоўскай школы № 4, краязнавец Аляксандар Лейкін. Мясцовыя ўлады яе падтрымалі.

Паводле Аляксандра Лейкіна, дом і пакой пісьменніка захаваныя, аднак будынак прыходзіць у заняпад, бо людзям, якія жывуць там, «у сілу стану здароўя складана падтрымліваць яго ў належным парадку». А дом-музей стаў бы цэнтрам прыцягнення турыстаў і месцам для правядзення рэспубліканскага літаратурнага свята, лічыць краязнаўца.

Але пакуль на рэалізацыю ідэі няма фінансавання, а таксама трэба вырашыць жыллёвае пытанне родных пісьменніка, якія жывуць у доме.

У лістападзе 2020 года на Рагачоўшчыне плануюць арганізаваць маштабны фестываль, прысвечаны 90-годдзю Уладзіміра Караткевіча. Запланаваны выставы, акцыі, літаратурныя конкурсы. Таксама вырашаецца пытанне з устаноўкай памятнага знака Гервасію Выліваху — галоўнаму герою «Ладдзі роспачы», якую Караткевіч напісаў у Рагачове.

Цяпер у Рагачове імя Уладзіміра Караткевіча носяць вуліца і цэнтральная раённая бібліятэка, партрэт Караткевіча змясцілі на тарцы аднаго з дамоў у цэнтры Рагачова, у мясцовым музеі ёсць некалькі кніг з аўтографамі пісьменніка, у многіх месцах устаноўленыя памятныя знакі.

Радыё Свабода

Лютаўскі «Дзеяслоў»

Выйшаў з друку першы за 2020 год і 104-ты ў агульнай нумарацыі «Дзеяслоў». Чым ён парадуе чытачоў?

Адкрывае часопіс паэма Уладзіміра Някляева «Вавукі», напісаная ў шведскім Лундзе, дзе паэт цяпер жыве.

Таксама ў паэтычнай частцы — вершы Людмілы Паўлікавай-Хейдаравай, Міколы Гіля, Анатоля Брусевіча, Вадзіма Караня.

Празаічная частка нумара пачынаецца з аповесці галоўнага рэдактара «Дзеяслова» Барыса Пятровіча «Пуцявіна». Аповесць пісалася праз трыццаць гадоў пасля паездкі аўтара на Сахалін і ёсць працягам аповесці «Пуціна». Цікава, што ў канцы гэтага твора, як і ў выпадку з паэмай Някляева, пазначана шведская лакацыя — горад Вісбю.

У нумары друкуецца пачатак яшчэ адной аповесці — «Нашчадкі казённага лёсу» Віктара Казько, прысвечанай няпростаму кону пасляваеннага пакалення бязбацькавічаў.

Аматараў прозы лютаўскі «Дзеяслоў» парадуе таксама «Вясковымі гісторыямі» Міхася Зізюка, апавяданнем Леаніда Левановіча «Пчаліная вернасць», а таксама — апавяданнем Ксеніі Крывецкай «Нарадзіцца нанова» (рубрыка «Дэбют»).

Рубрыка «Пераклады» прадстаўленая вершаванымі нізкамі двух украінскіх паэтаў — мэтра, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Украіны Дзмітра Паўлычкі ў перакладзе Міхася Скоблы, а таксама — «менскім цыклам» Вячаслава Лявіцкага, паэта, вядомага менскай публіцы па нядаўнім фэсце «Вершы на асфальце» (пераклад Сержа Мінскевіча).

У рубрыцы «Словы» — гутарка з італьянскім літаратарам Альда Анараці «пра італьянскую літаратуру і не толькі», у якой беларускі чытач пабачыць процьму паралеляў з сітуацыяй нашага літаратурнага працэсу.

У рубрыцы «Кантэкст» — «Вялікае Княства паэзіі Алеся Разанава» (пераклад Галіны Лінкевіч), сведчанні літоўскіх калегаў пра кнігу «Літоўскія пункціры», напісаную Разанавым ад пачатку па-літоўску.

Валянцін Акудовіч працягвае друкаваць свае ўспаміны. Гэтым разам спадар Валянцін распавядае пра гісторыю паўстання першага беларускага філасофскага часопіса «Фрагменты».

Таксама ў нумары: старонкі з новай кнігі Альжбеты Кеды, малюнкі з дзяцінства Кастуся Тарасава, штрыхі да творчага партрэта Алеся Ксёндзава і гутарка Уладзіміра Сіўчыкава з мастаком, рэпрадукцыі твораў якога ўпрыгожылі вокладку 104-га «Дзеяслова».

У рубрыцы «Кнігапіс» — рэцэнзія Эдуарда Дубянецкага на кнігу Святланы Явар «Дзівосны сад», а таксама — водгук Леаніда Галубовіча на кнігу літаратурнай крытыкі Паўла Абрамовіча «Мой спосаб чытання», якая нядаўна пабачыла свет у бібліятэчцы «Дзеяслова».

Традыцыйна завяршае нумар агляд кніжных навінак «Дзеяпіс».

Легендарны Ніл Гілевіч

Васіль ЖУКОВІЧ

1

Прайшло чатыры гады, як не стала Ніла Гілевіча (29 сакавіка 2016-га). У той жалобны час нібы самі прыйшлі да мяне словы смутку ад цяжкае страты і словы натуральнага гонару за здзейсненае Ім. Атрымаўся верш «Паэт купалаўскага гарту»:

Спачыў пясняр, не скажа больш
Слоў пранікнёных, палымяных,
За нашу Бацькаўшчыну боль
Больш не вярэдзіць сэрца рану.
Ён, дум высокіх валадар,
Прайшоў сваю дарогу годна,
А больш за ўсё жадаў змагар,
Каб Беларусь жыла свабодна.
За мову і за родны сцяг
Змагацца ўсёй істотай мусіў,
Праз церні церабіў ён шлях
Да незалежнай Беларусі.
Герой, над кім не ўладны час,
Любові нашай вечнай варты.
Быў, ёсць і будзе ён у нас,
Паэт купалаўскага гарту.

29–30.03.2016


Адначасова з вершам і ўслед за ім у памяць хлынулі ўспаміны пра слыннага творцу і прызнага чалавека. Узгадваліся шматлікія сустрэчы, сумесныя паездкі (у прыватнасці, у снежні 1994-га ў Берасце, дзе праводзілі ў апошні шлях Уладзіміра Калесніка, і ў верасні 2003-га ў Белаазёрск, дзе віншавалі з 60-годдзем Ніну Мацяш). Успомнілася і тое, як хораша Ніл Сымонавіч прамаўляў на маёй юбілейнай вечарыне ў касцёле імя святых Сымона і Алены і як жыва жартаваў пасля на вячэры...

Ляцеў час, і падкрадваліся хваробы. Народны паэт у апошнія гады рухаўся толькі ў межах кватэры. Калі ж я прачытаў у «Народнай волі», што ён пабываў у Бараўлянах, то не без трывогі, але спадзеючыся на лепшае, набраў нумар яго хатняга тэлефона. Калі запытаўся, чаго давялося быць у Бараўлянах, ён сказаў, што туды трапляюць не проста так. І адчуўшы мой неспакой, працягваў: «Васіль Аляксеевіч! Я гляджу на гэта па-філасофску: мне амаль 85. І я адбыўся!..». Ён ужо ведаў прысуд: анкалогія! І так па-багдановічаўску светла заявіў з прыцемку... нібыта ў працяг аднаго з вершаў:

Ніякі рахунак, ніякі разлік
Ужо мне не страшны:
я збыўся, Айчына.
Я марна не згінуў, бясследна не знік.
Мяне для цябе ўратавала Жанчына.

2

Ніл Гілевіч — не проста яскравая, адметная постаць нацыянальнае літаратуры, культуры, навукі, а постаць легендарная. Народны паэт Беларусі (1991), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1980), кавалер ордэна Кірылы і Мяфодзія. Прафесар (1978). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1980). Паэт, празаік, драматург, публіцыст, літаратуразнаўца, перакладчык, фалькларыст.



Апошні з літаратурных патрыярхаў.
Фота Віктара Талочкі, 2015 г.
Фота www.sputnik.by

Вялікая чытацкая аўдыторыя не магла не заўважаць: знакаміты наш класік надзелены ўніверсальным талентам. Усе віды літаратуры і ўсе жанры яму былі падуладныя. Найбольш поўна і разнастайна праявіў сябе Ніл Сымонавіч у цэху паэзіі, тут ён майстра на ўсе рукі: паэт-лірык, паэт-публіцыст, паэт-гумарыст і сатырык, паэт-песеннік, аўтар рамана ў вершах «Родныя дзеці» (1985), арыгінальнага маленькага лірычнага рамана «...І плямы на табе няма» (2003), унікальнага «Сказу пра Лысую гару» (1972), шэрагу кніжак для дзяцей... Які дзівосны паэтычны дыяпазон!

Звяртае на сябе ўвагу ягонае ўменне выказаць сябе, свае пачуцці, думкі, назіранні ў самых розных вершаваных формах, уласцівых найперш еўрапейскай паэзіі. Няхай у сучаснай беларускай літаратуры ўжо даўно не з'яўляюцца навінкамі вянкі вянкоў санетаў, ды ім дарогу праклаў у гісторыі нашай літаратуры вянок санетаў «Нарач» (1964), створаны Нілам Гілевічам. Выбітны паэт аблюбаваў яшчэ адну класічную форму верша, у выніку з'явілася кніга «Актавы» (1976). І на мінімальнай плошчы Майстру ўдавалася напоўніцу выказаць глыбіню пачуццяў і думак, данесці да чытача свае запаветнае, што засведчыў яшчэ адзін яго зборнік васьмірадкоўяў «Святлынь» (1984). Дасканалае валоданне размаітымі вершаванымі формамі асацыюецца з майстэрствам Максіма Багдановіча.

У Ніла Гілевіча дужа цікавыя, багатыя зместам пры дасканалай форме і сюжэтныя вершы, вершаваныя апавяданні, праўдзівыя проза, драматургія, эсэ, бездакорныя пераклады, узрушальныя прадмовы да выбраных твораў нашых класікаў. Нельга не заўважыць яго вялікай прыхільнасці да вуснай народнай творчасці. Ён уклаў і адрэдагаваў цэлыя тамы беларускага фальклёру, стварыў, апроч таго, кнігі пра паэтыку беларускай народнай лірыкі ды беларускіх загадак.

3

Але найбольш уражвае і радуе тое, што ён цягам усёй сваёй творчасці выступаў як няўхільны і паслядоўны патрыёт нашай мілай Бацькаўшчыны — за родную мову, культуру, за адраджэнне нацыянальнае свядомасці, супраць нацыянальнага нігілізму. Мне, яго сучасніку, прыемна знайсці і ў залатым фондзе каласальнай духоўнай культуры чыста гілевічаўскія красу лірыкі, моц публіцыстыкі, дасціпнасць гумару, сакрушальную сілу сарказму, багаты ўзор эпічнага палатна, кампетэнтнае слова пра паэтычную і спеўную спадчыну беларусаў, пераствораныя на матчынай мове мастацкія ўзоры знаных замежных творцаў.

Яшчэ ў 1966 годзе я з радасцю чытаў простыя і пранікнёныя яго радкі:

Край мой беларускі, край!
Дай ты мне паслухаць, дай!
Як на лад пявучы
Старажытнай мовы
Тут гамоняць пушчы,
Там шумяць дубровы, —
Дай жа мне паслухаць, дай!

Тады ж усхвалявалі яшчэ больш пранікліўыя словы заключнага чатырохрадкоўя верша «Не баюся, што мой век не вечны...»:

А мацней за ўсё я пашкадую
Перад тым, як свет пакінуць весні,
Што ўжо больш ніколі не пачую
Нашай роднай беларускай песні.


Але маё чытацкае знаёмства з паэзіяй Ніла Гілевіча пачалося нашмат раней — калі я толькі паступіў у Берасці ў педагагічны інстытут. У вольны час хадзіў па кнігарнях, набываў літаральна ўсе зборнікі беларускіх паэтаў. І вось займеў кніжку «Прадвесне ідзе па зямлі» (1959). Яго (другую па ліку) кніжку. Мне не забыць, як жа ўскалыхнула яна мне душу вершам «Маці»...

Я гляджу ў яе вочы,
Што свецяцца шчасцем,
Гладжу рукі сухія,
Прапахлыя зеллем,
І хілюся да сэрца...
А трэба б упасці
Перад ёю — нядужай, сівой —
На калені...

Паэт гэтак прачула распавядае пра сустрэчу з матуляю-сялянкаю ў родным двары, у сваёй вясковай хаце, куды ён, відаць, прыехаў з горада, з пяшчотаю гаворыць пра яе, вечна стомленую ў вірах бясконцае працы, звяртаецца (ад імя не толькі свайго — і ўсіх братоў, сёстраў) да маміных вачэй: «Вы над намі вясёлымі зоркамі ззялі», да вачэй, якія, калі нават «у нясцерпнай дрымоце зліпаліся», «усміхаліся нам, забаўлялі», звяртаецца да матчыных рук, якія аж нылі ўвечары, «спавіваючы нас перад сном галубіным» (я не ведаў тады, што паэт рос у вялікай сям'і, у якой было дзесяць дзяцей, двое з якіх памерлі малымі), звяртаецца да сэрца маці:

Наш боль быў тваім,
Не іначай,
Сорам наш
Ты насіла вялізарным горам,
Кропля ж кожная
Радасці светлай дзіцячай
Напаўняла цябе,
Разлівалася морам...

Гэтыя словы мною ўспрымаліся так, быццам яны — пра маю матулю, якую страціў юнаком, і таму яны, асабліва заключныя радкі пра тое, як позна мы, дзеці, «няўдзячнасць сваю разумець пачынаем», абуджалі ў душы шчымлівае пачуццё шкадавання. Невыпадкова кампазітар Павел Яроменка стварыў з верша цудоўную песню. Дарэчы, на вершы Ніла Гілевіча напісана мноства песняў вядучымі кампазітарамі: У. Буднікам, Я. Глебавым, Э. Зарыцкім, Л. Захлеўным, І. Лучанком, Э. Ханком ды іншымі. Я быў сведкам аншлагу ў Белдзяржфілармоніі, дзе цягам усёй вечарыны гучалі такія песні, а пасля выступаў улюбёнец публікі Ніл Гілевіч. Паломніцтва нагадвала і вечарына (з яго ўдзелам) у Доме літаратара, праведзеная паэтычным тэатрам «Зьніч» на чале з Галінаю Дзягілевай.



Фота www.belnovosti.by

Як чытач і як літаратар я з добрым хваляваннем разгортваў кожную новую кнігу Майстра: «Неспакой», «Бальшак», «Перазовы», «А дзе ж тая крынічанька», «У добрай згодзе», «Родныя дзеці» і многія іншыя. На іх у друку з'явілася шмат выдатных рэцэнзій такіх відушчых літаратараў, як У. Калеснік, Р. Бярозкін, А. Вярцінскі, М. Ермаловіч, Н. Мацяш, П. Макаль. Можна не сумнявацца: наперадзе і грунтоўныя даследаванні творчасці Ніла Гілевіча, ёмістыя манаграфіі, жыццяпіс народнага паэта, вучонага, фалькларыста, асветніка, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча.

4

У Ніла Гілевіча ўнушальная колькасць (больш за сто) выдадзеных кніг. Паспяхова прайшла і справа з выданнем 23-х тамоў выбраных твораў. Выбранае — гэта, вядома, частка ўсяго, што падараваў апостал духу свайму народу амаль за 60 гадоў актыўнай творчасці. Але не ў колькасці здзейсненага сапраўдная заслуга аўтара, а ў красе і сіле яго мастацкага слова, у тым, наколькі дзейсна служыць ягонае слова чалавеку, Бацькаўшчыне. Кнігі Ніла Гілевіча маюць невычэрпныя выхаваўчыя магчымасці, трывалы патэнцыял. Відаць, яны будуць цікавыя і карысныя і з цягам часу — для новых і новых генерацый.

Найбольш выдатная выхаваўчая роля вершаў для дзяцей. Здымаю з палічкі адзін з дзіцячых зборнікаў паэта — «Калі рана ўстанеш», разгортваю. На 13-й старонцы чытаю пра шпака:

Ён цяжкі шлях пераадолеў,
Пакуль вярнуўся ў родны край.
....
Смяецца сонца. Дзень прыгожы.
А шпак ля доміка свайго
Сядзіць і кліча ўсіх прахожых
Паслухаць песеньку яго.

Шпак спяваў у родным раздоллі, на волі. А вось злоўлены хлопчыкам конік (верш «Конік у палоне») спяваць не захацеў — і, шкрабаючы па дне шклянкі, ён нібы з крыўдаю кажа:

Сумна мне тут без сяброў
Аднаму ў палоне.
Адпусці мяне дамоў —
У прастор зялёны.
І прыходзь тады гуляць
На лужок мурожны:
Буду я табе спяваць
Дзень і вечар кожны.

І яшчэ адзін верш не магу не працытаваць:

Бацька ўзяў вялікі кош,
Сын — маленькі кошык.
У кішэні ў бацькі — нож,
А ў Сяргейкі — ножык.

Бо Сяргейка знае ўжо:
Рваць грыбы няможна —
Трэба нізенька нажом
Рэзаць асцярожна.

Вось вам і выхаванне дзяцей: і патрыятычнае, і маральнае, і працоўнае, і экалагічнае, а найперш — эстэтычнае.

У заключэнне скажу: у Ніла Гілевіча ёсць што пачытаць чалавеку любога ўзросту, бо ён — творца ўніверсальны.



Людміла АНДЗІЛЕЎКА

«Па» з матыльком



Фота www.9111.ru

Увесь свет змагаецца са мной... Я змушаны туляцца глухімі завулкамі, не жадаючы трапіць на вочы тым, хто няспынна палюе на мяне. Кожны дзень паштар прыносіць позвы з пракуратуры. Ён грукае ў дзверы маёй кватэры, распытвае суседзяў, заглядвае ў замочную адтуліну — ледзь дыхаю, хаваюся па кутках... Мая паштовая скрыня напіхана пакамечанымі лістамі і паведамленнямі з розных судовых органаў... Скрупулёзныя, законапаслухмяныя паштары дамагаюцца майго подпісу на новую і новую позву...

Я стаміўся... Я запалоханы, мяне непакояць начныя жахі, я пакутую на бяссонне, мяне пераследуюць слухавыя і зрокавыя галюцынацыі...

Аднойчы меў я неасцярожнасць будзённым сонечным ранкам шырока расчыніць акно і вытыркнуцца на вуліцу... Мая вуліца!!! Мае дамы, мой горад, неба, сонца... Радасць! Радасць!!! Я смелы! Я самаўпэўнены! Усё ў маім жыцці — як трэба! Так было і будзе! Гэты свет — для мяне! Гэтыя людзі са мной за адно...

Прыляцеў... фанабэрысты... выхваляецца ўборамі. Сеў на далонь, страпянуўся, расправіў фарсіста крылы ў «турэцкіх кашамірах» — махаон! Я для яго ўсяго толькі пасадачная пляцоўка... Рука мая паплыла ўверх: трымаецца ўчэпістымі лапкамі — лёгкае казытанне па жылах... Рука слізганула ўніз, управа, улева — балетныя «па» з матыльком. Набіраю паветра: ф-ф-ф-ф — я для яго вецер; ф-ф-ф-ф — бура! Крылцы затрапяталі. Узлятае — лаўлю... Я шчаслівы! Я адкрыты. Гэты свет — для мяне! «Людзі, я люблю вас!» — напалохаў махаона...

Мінак панура крочыў паўз мае вокны, дакорліва пахітаў галавой. «Людзі, я усіх вас люблю!» Некалькі прахожых спыніліся: «Непрыстойна так адкрыта выказваць свае пачуцці — які сорам!» Запатрабавалі: «Змоўкні!», «Прыраўняць усіх разам?! І забойцаў, і зладзеяў, і бамжоў, і маньякаў?!», «А псіхічна хворыя? А ўрэшце, сэксуальныя адшчапенцы?!», «Якая бездухоўнасць — усіх раўнуючы любіць! На ўвесь свет пра тое крычаць!», «А чужыя жонкі? Пасягаць на сямейны спакой?!», «Маўчаць! Маўчаць!» Я зачыніў акно, пырскаючы ад рогату, і стаў збірацца на работу...

Перад адыходам я зноў зірнуў на вуліцу — пад вокнамі скандзіраваў мітынг: «Маўчаць! Маўчаць! Маўчаць!» Арганізатары мас разгарнулі плакаты і транспаранты з патрабаваннямі «блюсці» цішыню і спакой. Вялікія белыя літары па чырвоным заклікалі: «Весяліцца толькі па агульнапрызнаных прычынах і ў прынятым парадку».

Транспарт аператыўна даставіў драўляныя драбіны, пры дапамозе якіх планавалася «браць» мае вокны.

Я зашчапіў засаўку і шчыльна захінуў фіранкі. Дзвярамі збег на работу... Наступным днём і была прынесена першая позва ў суд. Пракурор абвінаваціў мяне ў тым, што тры гады таму назад я адмовіўся вынішчыць у сваім палісадзе мае любімыя кветкі і па прыкладзе перадавых ініцыятыўных грамадзян — жыхароў нашага горада — разбіць клумбы з пунсовымі сальвініямі ў форме лозунгаў: «Мы — найшчаслівейшыя людзі свету!» Я не супраць лозунгаў — сальвініі не люблю...

Жадаючы заглушыць думкі пра судовыя мітрэнгі, я патроіў працоўны энтузіязм, гэтаму спрыяў і каляндарны дзень, які абяцаў завяршыцца салодкім змоўніцкім чаканнем ля невялічкага акенца з надпісам «КАСА», з якога кожнаму ў свой час прыемна «адшалясцяць» порцыю купюр...

Больш за ўсё грэла надзея, што ўжо на гэты раз не прадбачыцца ніякіх незапланаваных збораў, узносаў і падаткаў... Аналізуючы папярэдні разлік, кішэню апалавінілі: «чырвоны крыж», «ахова помнікаў», «выратаванне на водах», «барацьба з п'янствам і алкагалізмам», дапамога хворым і малазабяспечаным, а яшчэ — стварэнне музея мясцовых знакамітасцяў...

Але халодныя маланкі бліскучых акуляраў касіркі прадвясцілі гром паведамлення: грошай не хапае — будуць выдаваць часткова латарэйнымі білетамі.

Чарга зацята праглынула затоенае абурэнне, яно ператварылася ў пільнасць: дзясятак пар прагных вачэй рэўнасна сачылі за выкананнем справядлівасці: каб кожнаму адлічвалі па роўнай частцы «каляровых фанцікаў». Я паспрабаваў пажартаваць, што не цікаўлюся латарэяй, таму ніколі не купляю білеты — не маю ніякай ахвоты набываць іх і цяпер... Што тут пачалося!!! Чаргу нарэшце прарвала! І тыя, што стаялі за мной, і тыя, якія паспелі ўжо атрымаць грошы, але засталіся тут «добраахвотнікамі-назіральнікамі» з мэтай кантролю, абрынулі ўсю назапашаную злосць і крыўду — на мяне...

Працэс расправы са «злачынцам» учынілі на здзіўленне дружна і аператыўна, быццам кожны з калег меў загадзя распрацаваны і вывераны план дзеяння і выношваў яго не менш як палову жыцця. Мяне зацяснілі да акенца, акуратна пералічылі належную частку латарэйных білетаў, асобна — грошы, з дакладнасцю да капейчыны, увапхнулі роўненькім скрутачкам у нагрудную кішэню, паставілі маёй рукой подпіс і, задаволеныя ды гордыя выкрыццём парушальніка грамадскага спакою, актыўна выштурхалі на вуліцу...

Сябар мой адданы як мог падтрымліваў ува мне бадзёрасць духу. Праводзячы дадому, ён ашчадна паклаў руку на маё плячо і пранікнёна зазірнуў у вочы:

— Я хачу азнаёміцца з тваім унутраным распарадкам і жыллёвымі ўмовамі, — душэўна паведаміў сябар. — Так-так, мы ідзём да цябе...

Мне зусім не хацелася прыводзіць у свой дом гасцей сёння. Па-першае, знік настрой; па-другое, мне б хацелася самому выбіраць, перад кім адчыняць дзверы маёй кватэры... Па-трэцяе, я — сціплы грамадзянін: у мяне «горш чым» не багаты інтэр'ер, мой камп'ютар — пазаўчарашні дзень «тэхнічнага прагрэсу» сэканд хэнд... халадзільнік мой страляе і калоціцца, калі спрабуе падключыцца ў належны час да электрычнай сеткі, мой гараж ганебна пустуе... І наогул, мне не падабаецца, калі так нахабна і настойліва шчэмяцца ў маё жытло. Мой дом — мая крэпасць. Ці не так? Хто мае права азнаёмлівацца з маім побытам без майго на тое дазволу? Толькі я не змог прымусіць сябе прамовіць уголас хоць бы адзін з пералічаных пунктаў...

Я доўга кружляў з сябрам вакольнымі сцежкамі, спадзеючыся, што яму надакучыць сноўдацца пад дажджом і мы цёпла развітаемся... Не вытрымаў я. Ногі самі прывялі дадому. Ужо стоячы перад замкнёнымі дзвярыма, я безнадзейна ўхапіўся за выратавальную думку, стаў марудна корпацца па кішэнях, шукаючы «згубленыя» ключы. Сябар паверыў, але не адступіўся ад мэты вывучэння маіх побытавых абставін. Будучы натурай цэльнай і ахвярнай — перачакаваў разам са мною на ганку...

Раніцай да мяне прыйшла крыўдная думка: «Не смелы я чалавек!» Наведвала яна мяне і ўдзень, калі сябар раз-пораз падбягаў з настойлівым напамінам пра дублікат ключа... «Зусім баязлівец!» — дзяўбла бязлітасная думка маю галаву вечарам: хаваўся я ў прыбіральні, пакуль сябра мой абыходзіў аддзелы і кабінеты, не дачакаўшыся мяне ў прызначаным месцы...

Тым часам позвы няспынна заклікалі мяне да адказнасці перад грамадствам і дзяржавай... «Згуба» ключа аказалася сімвалічнай — з таго самага вечара я ні разу не ўваходзіў у свой дом праз дзверы. Мусіў пракрадвацца, як звечарэ, заднімі дзвярамі і сігаў праз кухоннае акно; не запальваючы святла, знаходзіў ежу, спешна вячэраў і, балансуючы на дыбачках, дабіраўся да ложка — ныраў у яго да раніцы. Падхопліваўся досвіткам, каб апярэдзіць мітынгоўцаў, і тым жа ходам: вітальня, кухня, акно, унутраны дворык — вылузваўся праз дзірку ў агароджы ў паркавы масіў...

Не магу сказаць, што існаванне маё ператварылася ў суцэльны бязмежны жах... Калі з дня ў дзень мне даводзілася бавіць светлы адрэзак сутак на беразе возера, я марыў пра лепшае — верыў і чакаў... І аднойчы да мяне падышла маладая жанчына, села побач і паклала сваю далонь на маю руку... Яна нічым не парушыла цішыню: задумліва пазірала на процілеглы бераг возера і пяшчотна тулілася да майго пляча... Так сталася — нечалавечыя пакуты цесна перапляліся ў маім жыцці з невыказным шчасцем.

Лёсам было наканавана нам падгледзець векавечны рух прыроды: як вясной пацягваюцца, скідваючы коўдры-пупышкі, ліпкія кволыя лісточкі, як усё лета на сваім магутным карэнні пасе волат-дуб мурашыны народ і спраўляе ў буйной кроне фэсты сімфанічных аркестраў птахаў-віртуозаў. Падслухаць шэпт замоў і заклёнаў дажджу над густым мурагом; сачыць, як дамавітая восень па-гаспадарску пераніцоўвае зялёныя аксаміты ў залатую парчу...

Я перастаў лічыць позвы, іх назбіралася поўная скрыня — даверху. Мае апаненты засумавалі, прыціхлі і мітынгоўцы — скруцілі транспаранты. На сцяну майго дома прышрубавалі шыльду, у якой пазначылі, што тут з такога па такое жыў я, тут і сканаў...

Карыстаючыся абставінамі, я разняволіўся, страціў пільнасць... Толькі-толькі развітаўшыся з каханай, не чакаючы цемры, натхнёны сустрэчай, кіраваўся я ў свой «мемарыяльны дом»... Мяне схапілі, мяне скруцілі, звязалі вяроўкамі, збілі з ног і — кулаччом і ботамі, кулаччом і ботамі — шчыра адвялі душу.

Урэшце мне ўручылі-ткі паштоўку. Я не мог зразумець, пра што паведамлялася ў ёй. Хоць паперу разгарнулі, разраўнялі і моцна сціснулі маімі ж рукамі, падсунулі пад самыя вочы. Хтосьці падняў з ходніка патрушчаныя акуляры і з сілай напяў на мой разбухлы нос. Хтосьці здагадаўся падсвяціць тэкст кішэнным ліхтарыкам — толькі б дайшоў да мяне сэнс друкаванага радка. І ўсё ж я не здолеў прачытаць нават літары. І яны, і папера былі чорнымі-чорнымі! Тады мне афіцыйна зачыталі тэкст: дасціпна, культурна і далікатна... У ім тлумачылася, што за даўнасцю часу з мяне здымаюцца ўсе папярэднія абвінавачванні — справы і скаргі закрываюць... Што ў мяне шчыра просяць прабачэння за дастаўленыя хваляванні і мітрэнгі, віншуюць мяне ад усёй душы і зноў выбачаюцца... І з нецярпеннем чакаюць у госці, каб азнаёміць з новай справай...

Мая... Мая каханая жанчына абвінавачвае мяне ў тым, што доўгія гады я пераследаваў яе, што не даваў ёй праходу сваёй назойлівасцю. Што подла і гнюсна падмануў яе, драпежна згвалціў, за што і павінен быць жорстка пакараны самай найвышэйшай мерай пакарання. Інакш яна не зможа спакойна адчуваць сябе побач... са сваім каханым мужам...

Старонкі з «памятнай кніжкі»



Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК

«Иногда нужно иметь противу себя озлобленных!»
Мікалай Гогаль

1 снежня 2019 г., нядзеля.

З'яўленне, а тады і даволі хуткае пашырэнне ў Расійскай імперыі чыгункі Фёдар Дастаеўскі адлюстраваў апакаліптычнымі фарбамі, — параўнаў чыгунку з зоркай палын.

Па сутнасці, такога перабольшання трымаўся й Леў Талстой.

Невыпадкова ж адзін вядомы рэжысёр паведаміў неяк у тэлевізійным выступленні: маўляў, каб напалохаць уражлівых чытачоў тым злом, якое, на думку Льва Талстога, прынесла чыгунка, знакаміты граф і прыдумаў трагічную гісторыю пра Ганну Карэніну.

А наш Якуб Колас у аповесці «У палескай глушы» выказаў удумнае захапленне здабыткамі сучаснай яму цывілізацыі:

«...Было штось велічнае, магутнае і захопліваючае ў гэтай імклівасці поезда. Мімаволі хацелася схіліць галаву прад геніем чалавечага розуму, атрымаўшага верх над бясконцымі адлегласцямі...».

Якуб Колас нібыта спрачаецца і з Дастаеўскім, і з Талстым, а найбольш з відавочна бліжэйшым да сябе Аляксандрам Блокам, стаўленне якога да чыгункі было драматычна-стрыманым.

Дарэчы, у такой гаворцы немагчыма не згадаць і яшчэ адно вялікае імя!

Вядома, Якуб Колас памятаў апісанне жахлівага будаўніцтва рэйкавай дарогі, якое даў у сваім гранічна-змястоўным вершы Мікалай Някрасаў.

І тут варта асобна адзначыць, што сярод будаўнікоў-пакутнікаў Мікалай Някрасаў убачыў і беларусаў!

Так, Якуб Колас памятаў някрасаўскі твор пра чыгунку і разумеў: неабходнае для людзей вырастае з людскіх жа трагедый, і захапляўся неабходным, бо яно неабходнае!

2 снежня 2019 г., панядзелак.

Што такое дакладнасць мастацкага адлюстравання?

Як адказаць на гэта пытанне?

Хіба што разгарнуць усё тую ж аповесць Якуба Коласа і прачытаць уголас першае ўбачанае:

«...Бабка не спіць. Яна проста думае свае старэчыя думкі, сухія, як і сама старасць, простыя, як і ўсё жыццё яе, нецікавыя, як і яе доля...»

Думкі сухія, бо сухая старасць!

Гэта ўражвае.

Дакладнасць мастацкага адлюстравання робіцца хараством.

3 снежня 2019 г., аўторак.

Малады настаўнік Лабановіч (галоўны герой аповесці «У палескай глушы») здзіўляецца — маўляў, чаму людзі звыкліся з тым, што памруць, чаму яны не выступаюць супраць смерці, аднак жа заўсёды зацята змагаюцца проці дробнага, малазначнага:

«...Калі парушаюцца драбязговыя правы, то чалавек гатоў грызціся за гэта і кусацца зубамі; там жа, дзе разбіваецца сама аснова, прынцып, ён пакорна згінае сваю галаву і моўчкі падстаўляе яе пад абух...».

Выходзіць, такая яна, выведзеная Якубам Коласам, вечная наша чалавечая памылка.

4 снежня 2019 г., серада.

Проза «У палескай глушы» — адначасова і мастацкі твор, і своеасаблівы зборнік этычных правілаў, якіх неабходна пільнавацца.

Мне здаецца, што самае асноўнае правіла Якуб Колас выказаў гэтак:

«...Навязваць... людзям сваю волю, вымагаць ад іх, каб яны рабілі іменна так, а не іначай, мы не маем права, бо хто можа паручыцца за тое, што мы не памыляемся?..»

Так разважаў пясняр на пятым годзе чырвонага панавання!

5 снежня 2019 г., чацвер.

Ідэалізацыя дзяўчыны ў нашай літаратуры, можна сказаць, асобная тэма.

Янка Купала ў паэме «Магіла льва» адносна гэтага прамовіў:

На беларускую дзяўчыну,
Калі тут праўду ёй аддаць,
Ніхто йшчэ каменем не кінуў
І не паважыцца кідаць...

Зрэшты, у «Магіле льва» перш за ўсё паказана крывадушная дзеўка Наталька; прыведзенае ж чатырохрадкоўе ўвасабляе дзяўчыну наогул, — вобраз дасканалай дзяўчыны.

А ў Купалавай паэме «Бандароўна» знаходзім ужо ідэалізацыю дзявочага хараства:

Хараства такога ў свеце
Не было, не будзе;
Аб ёй (Бандароўне. — Л.Д.-М.)
людзі гаварылі,
Як аб нейкім цудзе...

І ў Якуба Коласа (у маладога настаўніка Лабановіча!) да дзяўчыны (дзяўчыны наогул!) іконныя адносіны:

«...Лабановіч ніколі, нават у думках, не дазваляў сабе зняважыць дзяўчыну. Адно слова «дзяўчына» выклікала ў душы яго чысты і прыгожы вобраз, на які можна пазіраць і любавацца толькі здалёк...»

6 снежня 2019 г., пятніца.

І зноў жа твор Якуба Коласа нагадвае пра неабходнае, ну, скажам, хоць бы пра тое, што не трэба піць, а лепей штодня працаваць, што трэба навучыцца радавацца і пры гэтым ніколі не забываць пра смерць...

Здаецца, можна адсоўвацца ад людзей, але не варта аддаляцца ад прыроды, а сваё настаўніцтва (і любую іншую работу) лепш за ўсё ўспрымаць як з'яву дзяржаўную, а не бытавую.



Фота www.pikabu.ru

І што цікава, трэба ж імкнуцца шукаць здаровае (!) пачуццё, разумеючы — яно першаснае, бо:

«...Пачуванне ж ёсць папярэднік розуму ў доследах і вызначэннях сутнасці рэчаў...».

І ці не галоўнае ў творы: пясняр вуснамі Лабановіча гаворыць пра школу (навучальную ўстанову), у якой «...мова мацеры зневажаецца і забіваецца...».

7 снежня 2019 г., субота.

Завяршаючы гэтыя запісы, нагадаю: аповесць «У палескай глушы» — першая кніга трылогіі «На ростанях».

«На ростанях»!

Сімвалістыка назвы заўважана ці не ўсімі даследчыкамі.

Якуб Колас умеў сваім творам даваць загалоўкі; начытаны, адукаваны і надзвычай творча багаты, ён матэматычна дакладны ў фармулёўках:

«...формы жыцця абмежаваны, само... жыццё не мае граніц...».

У адным чалавеку ён бачыў усіх людзей; ведаў: у любых пытаннях (найбольш рэлігійных!) трэба быць памяркоўным, абачлівым, бо людзі жывуць не нейчым, а заўсёды сваім жыццём.

І вось, як трапна заўважыў:

«...палешукі не вельмі кідаліся да царквы...».

Сапраўды ж, дакладнае назіранне!

І Коласавы святары, дарэчы (тыя ж айцец Кірыла і айцец Мадэст) амаль не адрозніваліся ад сваёй паствы, бо ў духоўнай службе трымаліся болей жыццёвых, чым царкоўных правілаў, таму, лічу, можна сцвердзіць, што і яны «...не вельмі кідаліся да царквы...».

Здаецца, наш пясняр і такія ягоныя героі, як згаданыя святары, меркавалі: чалавек заўсёды на ростанях, на раздарожжы, на нервах, а раз так, то лішне лепей (штодзённая мудрасць!) не чапаць чалавека.

11 студзеня 2020 г., субота.

Сапраўды, шмат у чым аповесць Якуба Коласа можна ўспрымаць як скарбонку этычных правілаў, таму ўсё часцей і часцей думаю, што блізкая мне тая проза, і не толькі наша, а наогул, якая прывучае да парадку, дапамагае жыць, уплывае на пачуцці, нават можа цвяроза пакпіць з цябе:

«Ты верыў, што ўсё жыццё будаваў — не, дружа, ты ўсё жыццё разбураў... Ты спадзяваўся, напрыклад, што ўсе гавораць на мове любові, а кожны размаўляе па-свойму — хто баязліва, хто сквапна, хто хітра...».

Так, не толькі наша проза, а наогул...

От жа руская літаратура, умоўна кажучы ад Мікалая Гогаля да Аляксандра Салжаніцына, акрамя мастацкага ўздзеяння імкнулася яшчэ і выхоўваць чалавека, перабудоўваць ягонае жыццё.

Ствараліся вялікія павучанні (духоўныя дакументы!), у якіх якраз і было распісана — як жыць і працаваць, куды накіроўваць думкі і што чытаць, як любіць радзіму і людзей; якія павінны быць адносіны мужа да жонкі.

Гаварылася пра шкоду маркоты і згубнай аднабаковасці высноў, згадвалася вартасць разумення, паводле якога, скажам, імя рэчы бывае часам больш каштоўным, чым сама рэч!

Цікава даведацца з тых павучанняў пра жанчыну (пра тое, як павінна паводзіць сябе жонка губернатара!), і пра сэнс хвароб, і пра значэнні слоў, і, вядома ж, аб тым, што песняры (паэты) вышэй па грамадскай значнасці за праўнікаў (то-бок, законнікаў).

А па-над усім — тэма царквы і духавенства, ідэалізацыя Расіі, яе дзяржаўная веліч і (што істотна!) яе прыватныя страхі...

Так, я пра «Выбранные места из переписки с друзьями» Мікалая Гогаля.

Дарэчы, у назву свайго шэдэўра вялікі ўкраінец увёў, як бачым, назоўнік множнага ліку «друзья» і, здаецца, зрабіў гэта крыху ў іранічным сэнсе, бо не дзе-небудзь, а менавіта ж тут, на старонках «Выбранных мест...» заўважыў, што наогул у жыцці, калі казаць зусім шчыра, сяброў няма, пераважная большасць людзей пасварана, ці не кожны на кожнага ўзводзіць паклёп, сусед часта брэша на суседа, амаль ніякага сяброўства не існуе, а сябруюць (дзеля дробнай сваёй выгады!) толькі ашуканцы і махляры.

Праўда, якую не абмінеш!

Вось чаму сёння цяжка знайсці шчырага субяседніка сярод пыхлівых сучаснікаў, таму й шукаеш субяседніка ў літаратуры...


У 1835 годзе Мікалай Гогаль прамовіў: нам у музыцы патрэбна рускае, французскае надакучыла!

Уплыў ягоных слоў, можна сказаць, быў імгненны: у 1836 годзе Міхаіл Глінка напісаў оперу «Іван Сусанін».

Так, французскае надакучыла, і наогул непрыманне ўсяго чужога — таго ж каталіцтва, напрыклад, сталася ў павучаннях з'явай ці не дамінантнай.

У «Выбранных местах...» выразна акрэслена: Расія чуе Божы голас, а заходнія краіны — не; заходняя царква аддаляе чалавецтва ад Хрыста, праваслаўная ж — заўсёды разам з людзьмі!

Часам вялікі пісьменнік размаўляў, здавалася, мовай анёлаў і тады рабіў дзіцячыя высновы: як толькі паны пачнуць сумленна жыць, тады й парабкі, гледзячы на паноў, стануць сумленнымі, а Хрыстос, які дае мудрасць, — бясспрэчны аўтарытэт, як і рускі цар, дарэчы...



Кнігі Васіля Быкава ў электронным і аўдыёфармаце


У межах праекта «Лета з Быкавым», запачаткаваным Саюзам беларускіх пісьменнікаў і Kniharnia.by, тры аповесці класіка нацыянальнай літаратуры Васіля Быкава «Бліндаж», «У тумане» і «Пакахай мяне, салдацік» з'явіліся ў папулярных аўдыёфарматах (у тым ліку для iPhone, iPod, iPad).

Да ўсяго, чытачы могуць знайсці ў электронным фармаце ўсе выдадзеныя Саюзам беларускіх пісьменнікаў тамы з Поўнага збору твораў Васіля Быкава, а таксама яго зборнік-білінгву «Парадоксы жыцця» (па-беларуску і ў перакладзе на рускую мову Ірыны Шаўляковай).

На сайце Саюза беларускіх пісьменнікаў lit-bel.org можна бясплатна паслухаць першыя пяць раздзелаў кожнага з твораў Народнага пісьменніка Беларусі — раздзел «Бібліятэка / Аўдыёкнігі», а ў раздзеле «Бібліятэка / Электронныя кнігі» бясплатна спампаваць тэксты кніг.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 3 (163) | 27 сакавіка 2020 | № 12 (671) Новы Час

Сюды, дзе мы ёсць



Алесь РАЗАНАЎ

*

Слова ў вершы — пчала ў рої: яно мае суадгукацца з усім вершам, пазнавацца ўсімі астатнімі словамі і здзяйсняць ролю, вызначаную менавіта яму.

*

У вершах і ў лістах прысутнічае чыннік адлегласці: ёсць ён — і яны пішуцца, знікае — ім няма куды пісацца.

Вершы — лісты ў наступнасць.

*

У творчасці выяўляецца відушчы пачатак: ці гэта свечка, ці лучыніна, ці каганец — ён ад агню.

І нічым іншым — ні прачытаным, ні сустрэтым, ні перажытым, а адно ім, відушчым пачаткам, кмеціцца і ахрышчваецца мастацтва:

ёсць ён — ёсць яно,
ёсць яно — ёсць ён.

*

Спадарыня Тамара ідзе Роўным Полем і вітаецца, нібы яны павыходзілі са сваіх хат, з тымі, хто жыў вось тут і вось тут і каго цяпер тут няма.

Для староннягa чалавека яе паводзіны ў здзіў, а для яе звычайная з'ява: тыя, каго тут цяпер няма, застаюцца ў яе памяці, у ёй яна з імі, яны з ёй.

Памяць — асабовая айчына.

*

Пасля таго, як вярнуўся з падарожжа на той свет, дзве рэчы былі мне ў пярэчанне: класціся нанач спаць і апранацца ў чорнае.

І яшчэ вісеў водгук незасвоенай веды: быць — любіць, а ўсякі чалавек быў у дарунак.

*

Pereat mundus et fiat justicia (хай загіне свет, але спраўдзіцца правасуддзе) — гэтая, сфармуляваная некалі некім, выснова, чырвонаю ніткай праходзіць праз усе часы і праз усе жыцці. Праходзіць і дзейсніцца, але дзейсніцца не раптам і не адразу, а паступова і пастаянна — колькі доўжыцца самое жыццё, колькі доўжыцца сам час.

*

Метафізіка — тое, што было перад фізікай?..

Што было перад фізікай?

Усё тое самае, але не падзеленае на суб'ект і аб'ект, усё тое самае, але не разасобленае на слова і справу, усё тое самае, што было сваім.

*

Чалавек упісваецца ў тое, што ёсць, і з таго, што ёсць, выпісваецца. Калі б ён быў адно ўпісаны, супадаў бы з тым, што ёсць, і калі б быў адно выпісаны — мінаў бы і яно для яго станавілася б мінулым. Але ён такі і гэтакі, ён усё яшчэ стаецца сабой — і, у знадворным сустракаючы адлюстраванне ўнутранага, да ўсяго мае дачыненне.

«Які вуглаваты чалавек — за ўсё чапляецца...» — напісаў Янка Сіпакоў.

Чапляюся за верш.

*

У праграме дыскусія «Што такое беларуская літаратура?». Зададзены фармат — і ўсё, што тут ні скажу, загадзя меншае за тое, чаго не скажу, — меншае на самую беларускую літаратуру.

*

«Непачаты край работы!..» — абвяшчае спадарыня Святлана Вежнавец і паказвае рукою на агароды, засаджаныя бульбай, буракамі, агуркамі, памідорамі, морквай, капустай, гарбузамі ды кукурузай, на загарадкі, дзе рохкаюць свінні ды таўпехаюцца цяляты, на падворак і задворак, дзе корпаецца курыная гурма, на недакошаную лугавіну...

«Пачаты край!..» — кажу ёй насустрач. Яна любіць працаваць і, гледзячы на аднаго і другога суседа, што сярод белага дня злеглі ў траву, шкадуе найперш няспраўджаную справу.

Яны ёй нейкія сваякі, ды і самім Ратміравічам таксама, ды таксама й самой Беларусі, і той з іх, што мае прозвішча Сапега, вымаўляе яго калі з нейкім гонарам, калі з нейкаю вінаватасцю.

У свеце ідзе неабвешчаная вайна, і вось яны «ляжаць як падкошаныя». Ці — зваяваныя.

*

Ледзь павыторкваліся з зямлі, а ўжо чарвівыя — і баравікі, і падбярозавікі, і чырвонагаловікі... Пра што б ні вялася тутэйшая размова, яна закране і грыбную пару.

Гэта ад надвор'я, — кажуць адны.

Ад людзей, — дадаюць другія.

Людзі, надвор'е, грыбы — усё звязана між сабой так, што людзі не ведаюць, як усё гэта развязаць, а развязаўшы, звязаць нанова.

*

Чалавек да ўсяго мае дачыненне і на ўсё апраўданне, якое ўмяшчаецца ў словах: мусіць, так трэба.

Але любое «так трэба» вынік дзеяння, і ад таго, якое яно, гэтае дзеянне, залежыць, якім апынаецца тое «так трэба».

*

Страты выпадаюць з кругабегу часу і вядуць з чалавекам сваю размову, і ўсякая страта спрабуе даць яму нешта, чаго ўмясціць ён не ў стане і што наогул не здольна куды б ні было ўмяшчацца, — б е з д а н ь.

*

Калодзеж зусім непадалёку — за падворкам, але гаспадыня, выходзячы з хаты, накладае на дзверы замок.

«Адзін раз, не зачыніўшы хаты, пайшла ў лес, а вярнулася — сядзяць за сталом незнаёмыя людзі; другі раз, пакінуўшы дзверы адчыненымі, выйшла ў агарод, вярнулася, гляджу — па верандзе пахаджвае велічэзны сабака, ажно гэта воўк...»



Фота www.sputnik.by

Спадарыня Антаніна жыве ў Мурагах, у вёсцы, каля якое сніць свае сны возера Нешчарда і перад якою стаіць камень-валун з барэльефам Яна Баршчэўскага, аўтара «Шляхціца Завальні»: ён родам адсюль.

І самі Мурагі, аднойчы ўпісаўшыся ў «казкі і страшылкі» знакамітага земляка, хоцькі-няхоцькі, а і дагэтуль адчуваюць на сабе іхняе ўздзеянне.

*

Той, хто шукае Сэнс, пакуль шукае, не можа Яго знайсці.

Сэнс знаходзіцца, калі той, хто шукае, сам апынаецца знойдзеным Ім самім, а таму й сабою.

Самы відушчы пошук — імкненне.

*

Калі думкі птушкі — сінее неба;

калі думкі рыбіны — цякуць рэкі;

калі думкі пчолы — цвітуць кветкі, і вытлумачвае сам сябе свет.

*

Асабовасць — камень, укінуты на ўскрай мора. Яна безупынна шліфуецца, пакуль не выбавіцца ад краёў і няроўнасцяў, пакуль не стане дасканалай, пакуль канчаткова не супадзе з самім морам.

*

Гісторыя — геаграфія часу, і кожны яе абжывае па-свойму і знаходзіць у ёй сваю вотчыну і сваё месца.

*

«Она прекрасная сестра...» — трымаю ў руках даведку-атэстацыю, выдадзеную 11 лістапада 1936 года Надзеі Іванаўне Крыпан, медыцынскай сястры 1-й Мінскай Гарадской бальніцы, — маёй маці.

Ёй дваццаць чатыры гады: усемагчымыя выпрабаванні, сустрэчы, расстанні, страты, беды, перажыванні, — усё гэта яшчэ наперадзе. І праз усё гэта яна пранясе атрыманую даведку як наказ, якой яна мае быць, як запавет сваёй маладосці...

Папера пажоўкла, друкаваныя на машынцы літары пабляклі, а подпіс дырэктара клінікі, што стаіць пад даведкай-атэстацыяй, жывы і красамоўны: «Клумов».

Подпіс пад запаветам.

Подпіс-запавет.

*

Пасля месяца заняткаў новай мовай неспадзявана заўважыў, што яна да мяне не набліжаецца, а, наадварот, аддаляецца.

Прычына была на паверхні і адначасова мела глыбокую падаснову: стамілася імкненне — і перастала быць відушчым, а разам з ім пачаў згасаць і вынік.

Давялося адступіцца — вяртацца ў пачатак, калі тое, чым займаешся, табе ў цікавасць і ў адкрыццё.

*

Вершы, што пішуцца і чытаюцца, на якой бы мове ні былі напісаны, — транскрыпты мовы, што засталася ў пачатку, у тым пачатку, калі словам тварыўся свет.

*

Калі сустракаюцца двое, сама сустрэча становіцца нечым трэцім, што вызначае паводзіны тых дваіх і мае свой кшталт і модус.

*

Падышоў да той хаты, што пад ліпаю, і раптам, быццам іх нехта штурхануў знутры, дзверы адчыніліся...

Пакінутыя хаты — яны скрозь: і ў адной вёсцы, і ў другой, і ў трэцяй, на іх нават няма замка.

Хочаш — уваходзь, хочаш — усяляйся.

Але ўваходзіць не хочацца: у іх ужо нешта ўсялілася само — у іх усялілася нешта не тое.

*

«І са шчытом ці на шчыце
Ў краіну нашу зноў мы прыйдзем», —

гэтымі радкамі завяршаецца знакаміты верш-выклік Алеся Дудара.

Прыйсце доўжыцца, краіна аддаляецца і западае за далягляд, і адно вершы становяцца тымі ваярамі, якія туды даходзяць — са шчытамі і на шчытах.

*

Калі знемагае агонь, тады пераймае ўладу дым і курадым аб'яўляе свае выявы.

Ім няма месца ў агні, але і без агню іх няма, і яны не гасяць яго дарэшты, а ўпрыгожваюць — аздабляюць сабой.

Аздобнае — месца, дзе вядуць сваю гульню самасці.

*

«Я не анёл», — кажа адзін і кажа другі.

Але між гэтымі словамі і між самімі гэтымі людзьмі істотная розніца: адзін спрактыкаваны махляр, другі амаль праведнік.

*

Школа не для таго, каб у ёй заставацца, а каб, асвоіўшы яе праграмы і засвоіўшы ўрокі, яе пакінуць.

«Можна было б, я пражыла б сваё жыццё яшчэ раз», — кажа руплівая гаспадыня з Роўнага Поля, знахарка — знаўца ўсіх зёлак.

Пытаюся ў яе сына, што ўсё ніяк не абзавядзецца сваёю сям'ёю: «Чаму твая матуля хоча заставацца ў тым самым класе на другі год?»

Ён не мае адказу.

Яна таксама.

Жыццё — школа.

*

Жук, Жукаў, Жукоўскі, Жуковіч, Жукаўскас... — «жук», што так спраўна паўсяляўся ў людскія прозвішчы, мае мецы не абы-якія і адно яму ўласцівыя асаблівасці, імі вызначацца, імі пазнавацца, імі атэставацца, хто ён і што.

Хто ён і што? Літоўскае слова žuklys падказвае знанае: рыбак.

*

Верш пераймае асаблівасці эсэ і апавядання, эсэ і апавяданне — асаблівасці верша.

Але асноўная асаблівасць прозы, што застаецца адно з ёю, у тым, што яна кажа тое, што выяўляе; і асноўная асаблівасць паэзіі, што, у сваю чаргу, застаецца адно з ёю, у тым, што яна выяўляе тое, што застаецца нявыказаным.

*

Старасць марыць пра маладосць...

Не зважаючы ні на што і ні на кога, спадар Леанід, якому трохі болей за восемдзесят, ідзе Доўгаю вуліцай і нясе галінку ружовага бэзу. Ідзе са старасці ў маладосць.

Аднак тая, каму ён яе аддае, не хоча станавіцца ягонай спадарожніцай і, пацешыўшыся ды прыняўшы ягоны дарунак, наўзамен уручае яму сцяблінку крапівы ды яшчэ сцёбае ёю.

Ён яе не выкідае, трымае і разам з ёю падаецца тойсамаю вуліцаю назад — з пяклівай адзнакаю маладосці на руцэ.

*

З кожнай наступнай прыступкай папярэдняя пакідаецца, калі не пакідаецца — наступная не асягаецца.

Перашкоды — набыткі, якімі належыць авалодваць;

набыткі — перашкоды, якія належыць адпускаць.

*

«Біце ў сэрцы іх, — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!..» — радкі з «Пагоні» Максіма Багдановіча.

Чужынцамі становяцца знутры, калі згасаюць у сэрцах агні, калі знадворнае засланяе ўнутранае, часовае — вечнае, поцемнае — святое, разумовае — боскае.

Мечы прызначаны для таго, каб імі змагацца з ворагам, ваяваць, забіваць, але ў вершы ў іх іншае прызначэнне. Яны маюць тое ж прызначэнне, што і меч, пра які ў Евангеллі гаворыць Ісус Хрыстос: «Не мір прыйшоў Я прынесці, а меч». Меч — не забіваць, а абуджаць, не знішчаць, а ўваскрашаць, не губіць, а аднаходзіць.

Мечы ў «Пагоні» аднаходзяць сваё і сваіх.

*

Быццё вызначае свядомасць — і ўсё роўна свядомасць застаецца дарэшты не ўбыцыванай;

свядомасць вызначае быццё — і ўсё роўна быццё застаецца дарэшты не ўсвядомленым.

Але ў самім чалавеку дзейсніцца тое «дарэшты», што выводзіць яго за абсягі свядомасці і быцця ды іхняга распадабнення.

*

Мастацтва ва ўсім існым шукае падабенства, а знайшоўшы — адметнасці непадабенства, і калі знаходзіць — здзяйсняецца.

*

Мы тут, але нейкім чынам і там: калі б не былі там, не змаглі б знайсці дарогу туды.

Пачатак змяшчае ў сабе зярняты выніку і тым, што змяшчае, змястоўны.

*

Той, хто спяшаецца, наштурхоўваецца на тых, што наперадзе,

той, хто вядзе сваю мэту з сабою, ідзе сваёю хадой.

*

«Кур!.. Кур!.. — канваір хапае дваіх дзяўчатак за плечы, за рукі, штурхае, паказвае рукой на далёкую вёску. Гэтак ён хацеў іх вызваліць, адсылаў іх, каб яны прынеслі яму курэй, аднак яны не паслухаліся і засталіся з усімі», — Феня Габрусёнак вытлумачвае паводзіны канваіра, што ёй запалі ў памяць.

Вясной 1943 года яна, васьмігадовая дзяўчынка, апынулася ў гурце жыхароў, якіх з-пад Асвеі карнікі гналі ў Мілавіды, дзе адных застрэляць, другіх, зачыніўшы, спаляць у пуні, трэціх адвядуць у Саласпілс, лагер знявоненых.

У той наяве нялюдскасці яна вышуквае хоць якія моманты чалавечнасці, вылучае іх, затрымліваецца на іх, зберагае…

А мне тая сцэна бачыцца па-іншаму. Двое дзяўчатак спрабуюць уцячы, канваір (латыш, а не немец) хапае іх, спыняе, крычыць: «Кур?!. Кур?!.», што па-латышску азначае: «Куды?!. Куды?!.»

Кажу пра гэта гаспадыні. Яна доўга маўчыць, урэшце згаджаецца: «Мусіць, так». Яна адчувае сябе нібыта вінаватай, што гэтак доўга жывіла ілюзію, я — што яе парушыў.

*

Калі ўзыходзіш, належыць узыходзіць усёю істотай, калі не ўсёю, то там, дзе не ўсёю, утвараюцца прагалы і трэшчыны, у якія правальваешся, у якіх захрасаеш, якімі захопліваешся — відочна ці невідочна, адразу ці паступова, часткова ці цалкам.

*

Дапытлівыя вышукваюць у творах класікаў «аблуды» — дзе яны што сказалі не так ці напісалі не тое.

Аднак ва ўсім напісаным вось гэтым творцам у гэтым месцы і ў гэтым тэксце невідавочным чынам заўсёды прысутнічае ўсё ім напісанае, у сказаным — нявыказанае і невыказнае, і ў невыказным ён сам увесь.

*

Каб траціць сілы, неабходна быць дужым, і каб быць дужым, неабходна траціць сілы.

*

Memento mori!

Помніць пра смерць заўсёды недастаткова. Памяць проста не тая інстанцыя, якая ведае пра смерць усё і з якою смерць лічыцца.

Адзіная інстанцыя, якая ведае пра смерць усё і з якою смерць лічыцца, — Бог: ён у самім чалавеку, у самой ягонай сутнасці, куды і смерць не мае доступу.

*

Не да ўсяго льга датыкацца рукамі: можна ўпэцкацца, апячыся, параніцца, думкамі — гэтаксама.

*

Сярод зімы вясна, і людзі няпэўныя ў сваіх паводзінах, не ведаюць, ці ім радавацца, ці смуткаваць.

Знаёмца з замежжа, віншуючы з Калядамі, апроч усяго іншага зычыць «і цеплыні».

Адкладаю гэтае зычэнне на потым: цяпер цеплыня проста слата, проста гнілое надвор'е. Зычу сабе і краю снегу, завеяў ды маразоў.

*

Расстраляная літаратура…

Творцы расстрэльваліся і асуджаліся на знявленне найперш за тое, што яны творцы. І калі Фрыдрых фон Шлегель казаў, што гісторык — гэта прарок, звернуты ў мінулае, то паэт — прарок, звернуты ў сучаснасць: ён гаворыць тое, што асягае душа і ведае сэрца, а яна асягае больш, і яно ведае глыбей, чым якія б там ні было палітычныя праграмы і грамадзянскія маніфесты.

Адтуль, дзе іх няма, сюды, дзе мы ёсць, ідуць запаветы творцаў — іхнія лёсы, што сталіся мета-зместам саміх іхніх твораў.

*

Для таго, хто паварочваецца і йдзе назад, правае апынаецца левым.

Чалавек аднachасова і правы, і левы: куды б ні ішоў, ён вядзе з сабой адваротны кірунак, і сонца апынаецца то перад ім, то за ім.

*

Гучныя заявы бы надзьмутыя пухіры: яшчэ адна, што зусім нядаўна была на слыху і ў языцах — аб выгнанні «чырвоных чалавечкаў».

Чырвоныя чалавечкі — што гэта? Дзе гэта? І хто іх намерваецца выганяць? Нейкія іншыя чалавечкі? Якія? Рабыя? Чым яны адметнейшыя ад чырвоных?

Агучаны і агучваны некім дыягназ-пастулат пра чырвоных чалавечкаў — ён і самадыягназ, з якога высноўваецца самапершая ўмова: «Знаўца, разбярыся з самім сабою!.. Урач, ацаліся сам!..»

*

Даражылава: парушаныя будынкі, занядбаныя сядзібы, але адна хата жывая, і сядзіба, агароджаная плотам, дагледжаная.

А перад самаю хатай, у агародчыку, дзе квітнеюць вяргіні, узвышаецца пудзіла — у яго чалавечая постаць, на ім чалавечыя апранахі.

Нашто яно тут?

Гаспадар, што наведваецца сюды з Полацка па суботах і нядзелях ды на святы, тлумачыць: «Некага — каб вітаць, некага — каб палохаць, некаму — дык і пажаліцца на сваю долю, а з некім дык і пасмяяцца з яе: гэта ўжо залежыць ад таго, хто як яго ўбачыць».

Ну а самая першая пазнака, якую яно аб'яўляе ўсяму наваколлю і кожнаму, хто сюды прыходзіць: у вёскі ёсць хата, у хаты ёсць гаспадар.

*

Ці захаваць смяротнае пакаранне, ці адмяніць — усякае аднаяўнае «так» і «не» будзе аднабокім і аднавокім: нешта праміне і нечага не ўлічыць.

Самыя істотныя законы, дзякуючы якім існуе і развіваецца грамадства, маральныя. Гэта вядома здаўна, і Скарына пра гэта нагадвае: «Раней за ўсе пісаныя законы, правілы і правы ўсім людзям дадзены быў адзіны ад Госпада Бога існы закон».

Дзейнічае гэты закон — Бог паварочваецца да людзей, не — адварочваецца, і вызваленае месца займаюць сурагаты — рабаўнікі, хлусы, аўтарытэты.

Наш час змяшаны: у ім выяўляецца і сутыкаецца і тое, і гэтае, і адно, і другое. Другое, ва ўсякім разе пакуль што, мае калі не большую моц, дык большую людскую ўвагу — перавагу.

І самі людзі пакуль што.

*

«Бяззубая літаратура…»

Аднак зубы і нават язык не тыя органы, якімі творыцца літаратура. І адно тады, калі яна вольная ад «зубастага», «языкастага», «гарластага» і яшчэ якога саўдзелу, кажа свае слова.

*

Калі якія радкі ў вершы творца знаходзіць недасканалымі, не адпаведнымі вершу, ён іх закрэслівае, перапраўляе, шукае адпаведнейшыя і, каб знайшліся, разам з імі правіць і перапісвае самога сябе.

Знаходзіць — аднаходзіць: у творчасці аднаходзяцца першаўзоры.

*

Папярэднія пакаленні не мелі такой магчымасці, затое вы цяпер наслаждайцеся — выносіць на людзі сваю тэзу адна лаўрэатка.

І гэта арыенцір? І гэта формула шчасця? І гэта наказ у дарогу? Каму? Мажорам? А духоўны рост? А абавязкі перад людзьмі і Богам?

Яўны ці няяўны гэты наказ ужо вісіць на дзвярах дамоў распусты, смакавальнікаў наркоты, алкаголікаў.

Няхай з гэтай тэзай пройдзе па іхніх слядах — па знявечаных жыццях, разбураных сем'ях, зламаных лёсах, і што пачуе — запіша.

Зводзіцца насалодай — у гэтым ёсць нешта згубнае.

Зводзіць насалодай — у гэтым ёсць нешта ганебнае.

*

«Да заўтрага́», — кажа, развітваючыся, Віктар Яндула з Мілавідаў. І вось гэтае га стаецца падставай, каб сюды вярнуцца, каб пачуць тое, чаго яшчэ не пачуў, каб, як у жывую хату, увайсці ў тутэйшую гаворку.

*

Зямля і неба — яны з'яднаны між сабою адваротнаю суаднесінай. І адваротнаю суаднесінай з'яднаны з сабой чалавек: нябесны — ён перакулены ў зямное, зямны — у нябеснае.

Нішто неператворыцца ў пыл



Анатоль ДЭБІШ

У горне

Самотаю сэрца агорне,
Бядой беспрасветнай дыхне.
Нібыта жалезу, што ў горне,
Жыццём выпрабоўвацца мне.

Чым болей турбот і навалы —
Тым прага свабоды мацней.
Жалеза падатлівым стала,
Каб сталлю дамаскай звінець.

* * *

Дзень паціху сыйшоў за пагорак,
Хутка ноч кужаль змроку саўе.
Старажытнымі рунамі зорак
Неба піша паданні свае.

Час праз Вечнасць імчыцца ўпарта,
Голас продкаў між змроку не знік…
Нібы вершнік крылаты на варту —
Выйшаў з хмараў сівых маладзік.

Распарасонілася неба

Распарасонілася неба
Суквеццем красачак жывых.
Пасля дажджу паруе глеба,
І лёг туман на паплавы.

За лесам — сонца дагарае.
Чуцён царквы вячэрні звон.
І вечар дрэвы спавівае
У сон начны, салодкі сон.

Заняў паважна месяц срэбны
Трон ночы, нібы падзішах.
Распарасонілася неба,
Зямля, Сусвет, мая душа.

Растанне

Хутка поўнач. На вуліцы змрочна —
бы ў склепе.
І чужое ўсё. Мы з табою — чужыя.
Ліхтары не гараць, як калісьці —
паслепні
Вокны, веснiцы, ганкі —
нібы нежывыя.

Крочым вулкай пустою —
даўно не гаворым,
Нашы вусны марозам пякельным
скавала.
Аняменне і ціша. А толькі ўчора
Ўсё, дзе вокам не кінеш, —
цвіло, трапятала.
Пра каханні і шчасце шапталі
начамі
І ў абдымках спляталіся мы
да знямогі.
Ліхтары сарамліва блукалі за намі,
Шчодра кідалі гронкі святла
нам пад ногі.

Як зрабілася так, што чужымі мы сталі,
Што згубілі каханне сваё недарэчы?..
Заблукалі. Не там сваё шчасце
шукалі.
Ты — у золак пайшла, я кіруюся —
ў вечар.

* * *

У белым покрыве зямля,
Вядзе мяне праз пушчу сцежка.
Дадому сцелецца мой шлях,
Дзе маміна чакае ўсмешка.

Шатры ялін над галавой,
Бягуць насустрач мне бярозкі.
Кружляюць знічкі нада мной,
Ноч лепіць поўню — нібы з воску.

Мой шлях нялёгкі і даўгі, —
Ды, не зважаючы на стому,
Мінаю пожні і лугі,
Іду, праз многа год, дадому.

Вясну баюся прапусціць,
На зорных сцежках заблудзіцца.
А пад нагамі снег скрыпіць,
Бы ў хаце матчынай масніцы.

Ноч на Раства

Ноч на Раство. Гамонка на падворку.
Чакаюць цуду — дрэвы, птушкі, люд.
На небе Батлеемаўская зорка
Ўзышла і асвяціла ўсю зямлю.

Куццю па місках маці разлівае.
А за сталом і бацька мой, і дзед —
Малітвы твораць і Яго чакаюць,
Каб Веру даць:
Хрыстос прыйшоў на свет.

* * *

Нішто не ператворыцца ў пыл,
І продкаў прах аднойчы
уваскрэсне,
Каб стаць малітвай, музыкаю, песняй…
Нішто не ператворыцца ў пыл.

Яны паўстануць з ямаў і магіл.
Як сонейка з-за хмар
дзянёчкам веснім…
Нішто не ператворыцца ў пыл,
І продкаў прах аднойчы
уваскрэсне.

Адамавыя сыны



Валянціна АКСАК

Навіны

Расчынены вокны,
уключаны радыё,
тэлік і ноўт,
а навіны
ўсё роўна
прыходзяць
з душы.

Маладая

Ужо даволі
працяглы час
назіраю
за адным
зацятым двубоем.
Душы і цела.
Перамагае першая.
Напэўна, таму,
што —
маладая.

Ад Малухі — да Татухі

Не хачу разбуці рабыніча, —
сказала Рагнеда
бастарду Малухі,
якому тая спрытная баба
выдумала радавод.
Не хачу прызнаці прыплоду
з прыполу махляркі, —
сказаў нашчадак Рагнеды,
абмінаючы
кірмашовую дзеўку,
і прышпорыў каня.
Але Татуха
не спыняе намераў
упісаць
у княскія метрыкі
свайго байструка.
Навука
кіеўскай ключніцы
ўпала
на гнойную глебу
базарнага Слуцка.

Шчодрая дзеўка Татуха

Зазірнуць у шчылінку
княскае апачывальні —
любімы занятак
дваровае дзеўкі Татухі.
Ні працi, як Арыядна,
ані ткаць, як Пенелопа,
і ні кветкі ўзгадоўваць,
як каралева Бона,
яна не мае ахвоты.
Толькі пляткарыць
пра не ўбачанае
і не пачутае.
Княгіня шкадуе
шкадлівую дзеўку
і просіць Божачку
не караць
вельмі моцна дурнічку.
Татуха ж
шляхетную літасць
трактуе па-свойму
і шчодра
дамешвае чэмеру
ў акавіту княгіні.

Vol'e bene

Перад Калядамі,
як пацеры,
перабіраю зычэнні
сваіх рэальных сяброваk.
Вось Лера некалі ўведала,
што я дужа люблю
гранічную шчырасць радкоў
Anne Sexton,
а таму можа й сёння
ўбяруся ў пухнатую футру
і пайду ў свой carport,
і ўсядуся зручна
ў надзейную і даўна любімую
Toyota Corolla Verso,
і ўключу рухавік,
і застануся ў камфортным аўто
назаўжды.
Ах Лера,
ты трохі спазнілася —
я ўжо развіталася
і з Таётай,
і з усімі шафёрскімі завядзёнкамі.
Ната ж хацела,
каб я, як найболей
падобнай была
да Sylvia Plath.
Ну, ясная рэч,
хто ж тады,
як не я,
у імя найвышэйшага
эратаўзрушання
па ўласнай ахвоце
мог голаў усунуць
у газавую печку.
Мілая Ната,
Ты, пэўна, не ведаеш,
што ў маёй кухні
спраўна слугуе
электрычная Bosch.
Аксана жадала
заўжды аднаго —
перадозу.
Ну й дажадалася —
нуль праміле ў мяне,
а яна ўся запойная.
І на канец
віртуальных
колькі зычэнняў
успомню.
Мовы пазбудуся, —
прарочыла Таня.
Як чуеце?
Адкажыце!
І розум пакіне
істоту маю
трапяткую, —
казала іншая Таня.
З гэтым няясна.
Пакуль што.
Мо на Каляды
не спраўдзіцца
ейны праклён,
і я,
перажыўшы
amore
годна прайду
ўвесь свой шлях,
наканаваны Звышнім,
vol'e bene.

Хмурынкі, захмар'е і вечная цемень

Закапалася ў нетры
вярдлівасці
і прыкрасці шлю
на каханых.
Мне б твае болькі, —
сказала зажурана Ніна,
жонка Пятра.
Не ладзіцца ў справах,
і вінаватыя ў тым
блізкія і дарагія.
Як добра,
што мой Міхаіл
не чуе ўжо
гэткай глупоты, —
прамовіла Ганна
і адвярнулася ў скрусе.
Захмар'е бясконцай
прамозглай зімы
так мне абрыдла,
што хочацца
без аглядкі ўцячы
ў край вечнага сонца.
Не бывае
такога на свеце, —
прашаптала зблажэлая Вольга.
Убачыўшы ейныя
чорныя вочы,
якія да леташняе вясны
глядзелі на сына
балтыйскім блакітам,
я ўраз зразумела,
што жывых спасцігае
толькі вечная цемень.
І яна абрынаецца
неспадзеўна тады,
калі ўжо не маеш
каму пажаліцца
на хмурынкі
на ранішнім аквамарыне.

Інспірацыя

Манікюр.
Педыкюр.
Фрызура.
Рыхтуюся.
На ўсякі выпадак.
А раптам —
апошні прарыў да красы.
Вочы ў апачывальні
глядзяць з захапленнем.
Сукенка ў гасцёўні
ўсё тая ж
і тыя ж памеры.
Аднойчы
абраныя колеры
і сілуэты
жывыя
і праз сорак гадоў.
Акцэнты
на селязіне
і строга пазначаным стане
спраўныя і да сёння.
У суладдзі
з зяленівам зрэнак
зіхцяць
на шэрадзі
тлумнага вечара.
Зрэшты,
болей нічога
й не маю.
Сукенка ад мамы.
Твае вочы насустрач.
Цёплыя рукі
абапал дакліваrа стану.
І інспірацыя —
на заўтрашні дзень.

Ідэальны святар

Малады і натхнёны святар
раптоўна аднойчы прызнаўся
ў прыватнай гамонцы,
што ніколі не спавядае
сваіх родных і блізкіх.
На пытанне, чаму,
быў шчэ больш
нечаканы адказ,
што баіцца спакусы
выявіць свае
чалавечыя чуцці.
Гэта я разумею —
якая ж
можа быць
таямніца
між тымі,
каго любіш
і каму давяраеш.
Але зусім
мне няўцямна,
як жа можна
з міламаллю
назаўтра вітаць
кожнага верніка,
які сёння
такі спіс правінаў
на споведзі распавёў,
што яго
самы час
ад царквы
адлучаць.
Бог пачуў
і зрэагаваў, —
усміхнуўшыся, кажа
мой сумоўца святарны.
І дадае,
што сам ён
толькі транслюе
ў нябёсы
пра нязжытыя хібы
нашчадкаў
Адама і Евы,
і анічога пра іх
не носіць цяжарам
ва ўласнай душы.

Сэкс са скальпелем у руках

Самахоць аддалася Дзяніcу.
Падпалкоўнік медслужбы
прамаўляе паўшэптам
пра нешта ўзвышанае
і па-элінску бясклапотнае.
Вінадайныя словы ягоныя
цурчаць ручайком
па ўсіх маіх венах,
хмеляць думкі,
пазбаўляюць трывогі душу,
ацаляюць збалелае цела,
нараджаюць дзівосныя
гукі і вобразы,
запаўняюць наўколле
гармоніяй і весялосцю...
А як выплыла
з анестэзійнага аргазму,
то цвяроза ўсвядоміла,
што ніякі то быў
не Дзяніс,
а самы сапраўдны
Дыёніс.
Толькі ў спрытных
ягоных руках
быў не кубак
з гаючаю акавітай,
а скальпель,
бліскучы і гойстры.

Адамавыя сыны

У Піліпаўку йшлося чамусьці
пра Евіных дочак,
а ў Калядную ноч
усялякія згадкі пра іх
засталіся далёка,
дзесь за бліскаўкай
першае зоркі,
і з празрыстае хусты
агністага неба
ў душу паплылі
абрысы абліччаў
Адамавых сыноў,
і запаланілі мой свет
цёплыя ўсмешкі вачэй
гасцей трох вандроўных,
і азваліся яслі
першым новым,
нікім не паўтораным,
гукам,
і апынуліся
рукі мае
ў тваіх
любадайных
далонях.

На высокіх абцасах

Піліпаўская ваўчыца
захлынулася
ва ўласным голасе.
Крывыя вечары
спруцянелі
ў падманным усходзе.
Калядны агонь
спапяліў
тквань гнілую.
Набываю пантофлі
на высокіх абцасах.
Выпраўляюся
ў абмаладзелую вясну,



Малюнак Алега Амельчанкі, 2008 г.

не даткнуўшыся
леташніх ходнікаў.

Вячэра з закаханым футбалістам

А сёння восьмы год пайшоў,
як закаханая я ў футбаліста
аднаго вясёлага.
Пад вечар
ён вярнуўся
з нейкіх важных вельмі збораў
і так натхнёна распавёў,
што ўрэшце еў
той суп нясмачны,
але ж патрэбны дужа
для спартоўцаў,
што й я надумала
карміць яго
булёнам з морквай.
О не і не, —
пачула рэзкі тэнар, амаль фальцэт.
Не для таго
я так імкнуўся
да цябе,
каб зноў душыцца
гэтаю брыдотай.
Кумпяк з баравікамі, калі ласка!
І трошачкі шаткаванай капусты.
І для сябе асобна не гатуй,
калі ты сапраўды
мяне кахаеш.
Бо я ж вось
паліўку агідную
еў на зборах,
каб дзеля цябе
галоў
як найболей
забіваць.

Набуду каня рудагрывага

Аксаміты й ядвабы адпрэчваю.
Забываю паркалі і кашаміры.
Сукно стала лямчыцца,
і таму адрынаю сувоі
даўнейшага ткацтва.
Нават лён улюбёны
не вабіць
кужэльнаю светлынёю,
не кажучы ўжо
пра шарачковае зрэб'е.
Ашчаджаю
рублікі й эўры,
даляры і талеры,
на якія
ўжо хутка
набуду
каня рудагрывага
і паеду на ім
за далягляд хваляўладны.
На захад.

Плато

Убраўшыся калісь
у разнаколерную вясну
ў радзінным,
разлеглым на роўнядзі садзе,
усвядоміла раптам,
што хочацца ўверх
ад туманавага поплаву,
туды,
дзе па схілах пагоркаў
плятуць свае крозы
вінадайныя лозы,
і вінарні страчаюць
здарожаных пілігрымаў.
І пайшла без аглядкі,
каб не стаць
дзесь пры новым развоі
слупом саляным.
Шлях уверх
на высокіх абцасах —
асалода,
зраўнаная з кожнадзённым
эратаўрашаннем.
І вось скончыўся ўздым —
краявід без узгоркаў наперадзе.
Плато.

За якім — толькі строма.
Зноў па роўнядзі йду.
Ні квету лозаў, як у дзявоцтве.
І ні вінарняў, як у раскошы жыцця.
Цвяроза абрынуцца ў прорву —
найбольшы мой страх.

У сузор'і Арла

Птушыны шлях —
найлепшы ў цёмным небе.
У ім ёсць зорка Альтаір,
якая так зіхціць,
што хочацца
навечна затрымацца
бліз гэтай знічкі жніўня,
якую па-арабскі
можна патлумачыць,
як лятучага Арла.
Ну а далей там
Чаруе зорка Таразед,
якую мы ўжо ведаем,
як тую,
што ў Арла спынілася.
Прыветную, прыязную,
лагодную і летуценную.
Ідзем па гэтым шляху,
які, што праўда,
спрэс туман —
Barnard 143.
Прыдумка Зеўса —
Эўропа, Іа, Калісто і Ганімед.
І шчэ мо восем, дзесяць,
шаснаццаць ці дваццаць пяць
планетаў у сузор'і жніўня,
якое па шляхох птушыных
імкне ў мой лёс.
Але ў завершшы —
хлопчык Альтаір.
Любімец Зеўса.
Птушка, што ляціць —
Арол.

Насалода жыцця

Сёння быў дзень —
чароўная осім хаім.
Габрэі мяне зразумеюць,
пра што тут гамонка.
Дык вось —
пра осім хаім.
Гэта калі
ўсмешка ў вачох,
што насупраць,
за ранішняй кавай
замяняе
ўвесь свет за вакном,
і сонца можа працягваць
свой зімовы спачын,
калі за абедам дэсерт
праплыве раптам з кухні
ў схмялелую спальню
і Бетховен замоўкне
перад гукамі Джуліяні,
і калі вось цяпер
вогнішча й зоры,
і кубак гарбаты
адзін на дваіх.
Ну то — лэ хаім
за заўтрашні дзень
осім хаім.

Нябёсы стагоддзяў



Сяргей ПАНІЗЬНІК

Бясконцае ў вечнасці жыццё

«Такія нябёсы стагоддзяў,
як вочы ў Караткевіча Валодзі».
Данута Бічэль-Загнетава.
(Зборнік «Гускі вяртаюцца», 2020 г.)

Мы разбегліся па Мацерыку,
дзе гняздоўямі Гаўя, Каложа...
...Вось гляджу ў сваю Волту-раку.
Як пазнаць мне: чыё гэта ложа?

Пад нябёсамі белых буслоў
утрымала Данута на горцы
з хваляў Нёмана жменю слоў:
«Ўсё залежыць ад Стварцы».

Вось вам праўда ўся... Аналой
слёзы грэе для Маці Божай.
А грахі свае чапляй
недаверак падгрэбсці зможа?

Блаславіла скрыжалі дарог
беражыстае Беларусі.
Кроў блакітную —
Гаўі мурог
акрыляць — ёй пакінулі гусі.

***

— А зладзеі не саскрабуць
нашу Памяць. Жураўка — высока!
Не за лежнасць мяне хай паб'юць:
НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ кармлю сваім сокам.

Станіслаў і Генадзік са мной,
тата Яська, Марылечка-мама.
Зноў блакітнай крывёю вясной
для Жыцця мне адкрыецца Брама.

Вечнасць — гэта Прадвесніка знак
на магутнае крылле паэта...
Для Бясконцасці (хто з нас лайдак?)
паслужу: Беларусь мне — планета!

Так, Нябёсы Стагоддзяў пры мне,
і малітва душы ў кожным вершы.
Як вяртаюцца гускі вясне, —
мне вяртаецца Ойча з-пад Вежы.

Валадарства яго не міне
ранкам, днём, у намоленым сне —
з Роднай Нацыяй
быць у суцешшы.

P.S. Гора дні не ў Горадні
і не ў падваротні...
Я ў шчаслівай святасцю
светлае Гародні,
дзе даўно быў з ветласцю радасна
крануты
лёзнымі падкрылкамі шчырае Дануты.
І не з путамі прымкнуты быў, — гожа
да паднόжжа асцярожнае Божае Каложы.

На Хрышчэнне Гасподняе, 2020 г.

Беларускія нарадавольцы



Уладзімір АРЛОЎ

Пасля паўстання Кастуся Каліноўскага ў беларускіх губернях дзейнічалі асаблівыя жорсткія законы. Цяжэйшым стаў нацыянальны ўціск. Пад забаронай заставалася беларуская мова. На ёй нельга было друкаваць кнігі, газеты і часопісы, забаранялася размаўляць у дзяржаўных установах. Расейскія ўлады за ўвесь час гаспадарання на нашай зямлі не дазволілі адчыніць аніводнай беларускай школы. З 1840 года забароненай была і сама назва «Беларусь». Невыпадкова якраз яе каліноўцы ўзялі для свайго паролю. Каланізатарам не ўдалося запалохаць край. На змену ваярам 1863-га прыходзілі новыя адважныя людзі...

Людзі нязломнага духу

У 1870-я гады ў Расейскай імперыі набраў сілу рэвалюцыйны рух народніцтва. Многія з гэтых рэвалюцыянераў лічылі, што царызм можна перамагчы, калі «пайсці ў народ»: апрануць сялянскае адзенне, хадзіць па вёсках, раздаваць простым людзям кнігі, весці з імі гаворку пра тое, што нельга цярпець уладу цара і яго памагатых.

Але сяляне сустракалі такіх «хадакоў» насцярожана, часта здавалі іх паліцыі. Тысячы народнікаў і тых, хто ім спачуваў, былі арыштаваныя і засуджаныя на доўгія тэрміны. Расчараваўшыся ў «хаджэнні ў народ», частка рэвалюцыянераў пастанавіла перайсці да збройнага змагання і стварыла падпольную партыю «Народная воля».

Адзін з першых народніцкіх гурткоў у Беларусі заснавалі ў Магілёве навучэнцы мужчынскай гімназіі і духоўнай семінарыі. Такія гурткі дзейнічалі ў Менску, Віцебску, Слуцку, Воршы, Горы-Горках, Пінску.

Вядомымі народнікамі сталі нараджэнцы беларускіх губерняў Мікалай Судзілоўскі, Рыгор Ісаеў, Анатоль Бонч-Асмалоўскі, Антон Барэйша, Сяргей Кавалік, Язэп Лукашэвіч, Геся Гельфман. Яны прайшлі праз арышты, турмы, сібірскую катаргу, але не гублялі веры ў сваю праўду, захоўвалі гонар і годнасць.

Язэп Лукашэвіч

Гэты народнік (родам з-пад Вільні) быў прысуджаны да пажыццёвага зняволення ў страшнай Шлісельбургскай турме. Праз некалькі гадоў вязням дазволілі перадаваць кнігі, і Язэп стварыў «турэмны ўніверсітэт». Зняволеныя рэвалюцыянеры займаліся геалогіяй і біялогіяй, хіміяй і фізікай, псіхалогіяй і філасофіяй.

Шлісельбургскія «студэнты» захапляліся самаахвярнасцю «прафесара» Лукашэвіча. Калі ў часе лекцыі яму трэба было маляваць геалагічныя карты або схемы, Язэп для чорнай фарбы браў копаць з турэмнай сцяны, для сіняй — сашкрабаў пазногцямі сінюю палоску на сцяне камеры, а для чырвонай ужываў уласную кроў.

Улада вырашыла выкарыстоўваць навуковыя распрацоўкі вязняў. З імі дазволілі звязацца аднаму з пецярбургскіх музеяў. Лукашэвіч з таварышамі атрымаў замову скласці калекцыю па батаніцы, мінералогіі ды палеанталогіі (навуцы пра выкапнёвыя парэшткі раслін і жывёлаў) для Сусветнай выставы 1889 года ў Парыжы. Калекцыя была адзначаная залатым медалём, аднак на выставе ніхто так і не даведаўся імёнаў сапраўдных лаўрэатаў.

Геся Гельфман

У арганізацыях беларускіх народнікаў было нямала жанчын. Адна з іх — мазыранка Геся Гельфман — наймала ў Пецярбурзе кватэру, дзе нарадавольцы выраблялі бомбы для забойства цара Аляксандра ІІ. Жандары высачылі і схапілі Гесю.

Маладую жанчыну прысудзілі да смяротнага пакарання на шыбеніцы. Але нарадаволька павінна была нарадзіць дзіця, і ў многіх еўрапейскіх краінах разгарнулася змаганне за яе жыццё. У Лондане і Брусэлі адбыліся мітынгі ў падтрымку Гесі. Цару прыходзілі сотні лістоў з патрабаваннямі захаваць ёй жыццё. Адзін з такіх лістоў напісаў французскі пісьменнік Віктор Гюго.

Хадайніцтва памілаваць рэвалюцыянерку на імя расейскай імператрыцы падпісала тысяча італьянак. Еўрапейская кампанія ў абарону Гесі Гельфман змусіла царскіх суддзяў замяніць смяротную кару вечнай катаргай, ды самой нарадавольцы пра гэта не паведамілі.

Да нараджэння дзіцяці заставалася чатыры месяцы. Турэмныя каты не пакідалі дапытваць Гесю, марна спрабуючы вырваць у яе паказанні. Пра замену прысуду сказалі адно перад родамі. У хуткім часе Геся, пазбаўленая дапамогі дактароў, памерла. Ненадоўга перажыло маці і няшчаснае дзіця.

Так распраўляліся з тымі, хто меў адвагу кідаць выклік царызму...

Прэзідэнт Гавайскіх астравоў

Адзін з самых знаных у свеце беларускіх народнікаў — магілёвец Мікалай Судзілоўскі.

Студэнт-медык Кіеўскага ўніверсітэта, ён быў у ліку выдатнікаў. Захапіўшыся рэвалюцыйнымі ідэямі, Мікалай узяў удзел у «хаджэнні ў народ». Адурманеныя царскай прапагандай сяляне данеслі на Судзілоўскага ў паліцыю. Каб уратавацца ад арышту, ён назаўжды пакінуў імперыю.



Выбух другой бомбы падчас забойства расейскага імператара Аляксандра ІІ. Малюнак Арнольда Балдынгера, 1881 г.



Ігнат Грынявіцкі (1856–1881)

Мікалай стаў доктарам медыцыны, але адмовіўся ад спакойнага заможнага жыцця, якое яму магла даць гэтая навуковая ступень. Пасяліўшыся ў Румыніі, Мікалай Судзілоўскі займаўся пастаўкамі зброі балгарскім паўстанцам, што змагаліся з турэцкім прыгнётам. У адным з рэстаранаў Бухарэста былы народнік зладзіў святочную вячэру ў гонар Парыжскай камуны.

Ратуючыся цяпер ужо ад румынскай паліцыі, Судзілоўскі трапіў у Амерыку. Ён жыў на Гавайскіх астравах і праславіўся там як лекар, што вярнуў здароўе сотням беззнадзейна хворых астраўлянаў. Па сваёй натуры былы народнік не мог заставацца ўбаку ад палітыкі. Гаваі імкнуліся да незалежнасці ад ЗША, і Мікалай Судзілоўскі далучыўся да змагароў за свабоду. Ён меў такі вялікі аўтарытэт, што гавайцы абралі яго спачатку сенатарам, а потым і прэзідэнтам Гавайскіх астравоў.

Пазней Судзілоўскі жыў у Японіі ды Кітаі, авалодаў мовамі гэтых краін. Ён застаўся ў гісторыі як падарожнік і географ, адкрыў некалькі астравоў у Ціхім акіяне. Разам з тым быў здольным хімікам, біёлагам і аграномам.

Цягам усяго жыцця Мікалай Судзілоўскі заставаўся верны юначым народніцкім перакананням. Калі ў Расеі перамаглі бальшавікі, ён адмовіўся вяртацца на радзіму, бо прадбачыў, што яе чакаюць цяжкія выпрабаванні. Як толькі ў савецкай Расеі пачаўся голад, былы народнік арганізаваў першы ў Азіі «Камітэт дапамогі галадаючым Расеі».

Пра Судзілоўскага ў розных краінах свету напісаны сотні нарысаў, артыкулаў і кніг.

Рэвалюцыянеры памыліліся: ніякіх хваляванняў у народзе забойства цара не выклікала, а палітыка новага ўладара імперыі стала значна больш жорсткай

Запавет Ігната Грынявіцкага

Партыя «Народная воля» асудзіла цара Аляксандра ІІ на смерць. Рэвалюцыянеры разлічвалі, што выкананне гэтага прысуду выкліча ва ўсёй імперыі народнае паўстанне. З сарака сямі добраахвотнікаў, што хацелі прынесці жыццё ў ахвяру дзеля перамогі рэвалюцыі, кіраўніцтва «Народнай волі» абрала чатырох. У гэтую групу трапіў Ігнат Грынявіцкі.

Ігнась быў сынам беларускага шляхціча. Ён вучыўся ў Беластоцкай гімназіі. Там даведаўся пра таемнае таварыства «Вайсковыя сябры», што некалі сарвала ў размешчаных вакол Беластока імперскіх палках прысягу Мікалаю І. Юнак ведаў імёны герояў 1863 года Кастуся Каліноўскага, Валера Урублеўскага, Зыгмунта Сераkоўскага. У рукі беластоцкіх гімназістаў траплялі нумары газеты «Мужыцкая праўда». Ужо тады Ігната захапіла мара вызваліць Айчыну ад царскага прыгнёту.

З гімназічным атэстатам, дзе былі толькі выдатныя адзнакі, Грынявіцкі быў залічаны ў сталічны Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Выкладчыкі адразу вылучылі бліскуча падрыхтаванага і адказнага юнака. Яму абяцалі выдатную кар'еру інжынера або вучонага. Але Ігнат неўзабаве ўступіў у «Народную волю». Ён збіраў грошы на патрэбы палітычных вязняў, гаспадарыў у так званай «нябеснай канцылярыі», дзе рабілі неабходныя рэвалюцыянерам дакументы. Адначасова Грынявіцкі ўвайшоў у лік тых, хто сачыў за паездкамі цара, а затым — тых, каму даручылі выканаць смяротны прысуд.

Напярэдадні дня, вызначанага для рашучых дзеянняў, Ігнат склаў запавет. Ён прадбачыў, што ягонае маладое жыццё хутка абарвецца. «Недалёкая будучыня пакажа: мне або іншаму давядзецца нанесці апошні ўдар, рэха якога разнясецца па ўсёй Расеі, — пісаў Грынявіцкі. — Што будзе далей? Ці шмат яшчэ ахвяраў запатрабуе няшчасная радзіма дзеля свайго вызвалення?»

Гэты апошні ўдар 13 сакавіка 1881 года выпала зрабіць якраз беларусу Грынявіцкаму. Пасля выбуху бомбы на набярэжнай Кацярынінскага канала ў Пецярбурзе Ігнат перажыў імператара ўсяго на некалькі гадзін.

Рэвалюцыянеры памыліліся: ніякіх хваляванняў у народзе забойства цара не выклікала, а палітыка новага ўладара імперыі — Аляксандра ІІІ і ягоных міністраў стала значна больш жорсткай.

Сродкі змагання нарадавольцаў былі памылковыя, аднак гэтыя мужныя ахвярныя людзі заслужылі памяць нашчадкаў.

«Гоман» загаманіў пра Беларусь

Ігнат Грынявіцкі помсціў цару і за расправу над каліноўцамі, і за тое, што была пад забаронай для друку і ў школах беларуская мова, што нельга было карыстацца самім найменнем «Беларусь».

У 1884 годзе пецярбургскія студэнты з Беларусі выдалі два нумары часопіса «Гоман». Грынявіцкага яны называлі папярэднікам і гарачым аднадумцам. «Мы — беларусы і павінны змагацца за інтарэсы беларускага народа», — гаварылася ў першым выпуску «Гомана».

«Гоманаўцы» заклікалі суайчыннікаў не абмяжоўвацца вывучэннем роднага краю і асветаю яго жыхароў. Яны пераконвалі беларусаў, што ім неабходна змагацца за палітычныя правы. Аўтары часопіса сцвярджалі: Беларусь мае магутныя сілы, у якія трэба ўрэшце паверыць. «Гоман» нагадваў пра жыццёвую трываласць беларусаў, што не зрабіліся ні палякамі, ні расейцамі. З гонарам успамінаючы вызвольныя паўстанні 1831 і 1863 гадоў, часопіс прадказваў, што хутка распачнецца новы этап барацьбы за будучую самастойнасць Айчыны.

ГІСТАРЫЧНАЯ ВІКТАРЫНА

Гістарычная віктарына

1. Хто такія народнікі?
2. Хто з вядомых народнікаў паходзіў з Беларусі?
3. Як працаваў «турэмны ўніверсітт» Язэпа Лукашэвіча?
4. Чаму ва ўсёй Еўропе змагаліся за жыццё Гесі Гельфанд?
5. Чым адметны жыццёвы шлях Мікалая Судзілоўскага?
6. За што варты пашаны беларус Ігнат Грынявіцкі?
7. Што пісаў пра беларусаў і Беларусь часопіс «Гоман»?


Ахінуты матыльком і бліскавіцай

Віктар ЯРАЦ

Игорь Шкляревский. Ожерелье сушёных грибов. — Мінск: Кнігазбор (Бібліятэчка часопіса «Дзеяслоў»).

Творы нашага земляка Ігара Шклярэўскага, які займеў трывалае месца ў сучаснай рускай літаратуры, прыцягваюць да сябе адразу. Яны ўражваюць. Не адпускаюць. Запамінаюцца...

«Ожерелье сушёных грибов» даволі шматпланавае — тут не толькі «Стихи, поэмы, эссе», звязаныя тэматычнай дамінантай з роднай аўтару Беларуссю. Акрамя гэтага — і пераклады-перастварэнні на сучасную рускую мову паэм «Песня пра зубра» і «Слова пра паход Ігаравы», напісаных паводле анатацыі «выхадцамі з беларускіх земляў», і аб'ёмная, па-сапраўднаму



змястоўная, з моцным пульсам праблематыкі нашай рэчаіснасці гутарка паэта з Міхасём Скоблам пад назвай «Залатая блешня і каралі сушаных грыбоў»...

Паэзія Ігара Шклярэўскага натуральна пантэістычная па сваёй сутнасці, па разуменні дыялектыкі ўсяго жывога, адкрытай і прыхаванай ад людскога вока сувязі ўсяго існага.

У паэта і страказа, і мурашка, і жук-плывунец, і самая дробная кузюрка — не антураж і не экспанат у заалагічнай калекцыі, як і кожная зёлка, расліна і лісток — не для гербарыя натураліста. Для яго ўсё гэта — і ён сам. І ён адначасна і зямны, і нябесны, бо ў ім і з ім і подых неба, і зямная дрогкасць.

А пачынаецца шлях у нязведаны свет у напаўгалодным дзяцінстве па-юнаму дзёрзка, са смелым эпатажам насуперак далёка не ласункавым пасляваенным гадам:

Знаешь, кто я такой
с перебитой рукой
и в одежде, висящей нелепо?
Заместитель директора синего неба.
Главный бухгалтер ворон.
Дирижёр приднепровского
майского жабьего хора.
Я парад журавлей
принимаю с вершины забора!

Усё самае істотнае ў вершах, паэмах, перакладах І. Шклярэўскага — ад любові сапраўднай, без позы і крыку з эстраднымі рэверансамі, без шматслоўнасці. Ён надзвычай лаканічны ва ўсіх жанрах, дзе мастацкая сіла, гарманічная бездакорнасць дасягаюцца ёмістасцю сродкаў, асацыятыўнай энергетыкай, маляўнічасцю вобразаў, учэпістай зрокавасцю параўнанняў:

Там баркалабовские грозы
Прошли, и мокрые стрекозы
блестят у брата на спине.

Там детство ловит в быстрине
форель прохладно-золотую,
и ласточкой в моём окне
там счастье ставит запятую.

Тое, што кожны творца (паэт і празаік, драматург і жывапісец, кампазітар і дойлід, скульптар і даследчык слова з божым дарам) «родам з дзяцінства» — засведчана тысячы разоў. Адтуль, ад першых крокаў па зямлі, тчэцца ніць жыцця кожнага, хто прыходзіць у гэты свет, ніць, якая нярэдка можа абарвацца так дачасна:

Я помню этот звон в ушах
и эту странную весёлость.
От магазина в трёх шагах
вдруг возникает невесомость.
И я смеюсь...
Буханка хлеба
меня не отпустила в небо.

У гэтых радках з фрагмента ўспамінаў пра дзяцінства («Стихи о невесомости») — непрыхарошаны і без сентыментальнасці паказ якраз таго пачатку шляху, на якім будзе ўсё: і шчодрасць людская, і сквапнасць, і шчыры давер, і хцівы падман. Будзе, як было вякамі: і цемра, і зло. Але ж будзе — і надзея. І на светлыню, чысціню, высакародства, любоў, дабрыню.

Незаможныя дзяцінства і маладосць згадваюцца часта як свята. Высновы ўзрост раскваечаны шчодрасцю пачуццяў, разнасцежанай завяззю спадзяванняў, жаданнямі дасягнуць нават немагчымага. З гадамі паэт, па-філасофску асэнсоўваючы пройдзеныя дарогі, спакойна, без клічнікаў, прызнаецца:

Когда на берегу Днепра
ночь коротаю у костра,
лицом горю, спиной дрожу,
под бок подсовываю сено
и до утра в костёр гляжу,
мне кажется, что я живу
во всех веках одновременно.

Для І. Шклярэўскага верш, у якім болей чатырох катрэнаў, ужо досыць аб'ёмны. Шануючы вагу слова, ён імкнецца быць як мага больш эканомным, сцІслым у лексічным плане. І ў сюжэтным, зусім не кароценькім творы «Воспоминание о славгородской пыли», у якім амаль пратакольнае хранікёрства, россып фактаў (што тлумачыцца мастацкімі прынцыпамі адпаведнага паказу, «заземленага» да самых драбніц — побытавых, паўсядзённых — адлюстравання), усе дэталі шчыльна спалучаны ў шырокай апавядальнай плыні.

Пры ўсім гэтым — ніякай прахаднай, інфантыльнай ілюстрацыйнасці. Падпарадкаванасць агульнай задуме стварэння рэалістычнага палатна — без псеўдапафаснасці, без трубадурства. З другога боку — без снабіцкага скепсісу і распаўсюджанай бадзёра-лёгкай гульлівасці. Ад падобных рэцыдываў імунітэт Ігара Шклярэўскага з гадамі ўсё больш аберагаў, усё болей узмацнялася арганічнае неўспрыняцце гульні ў паэзію, у заняткі рыфмавання з мэтай пацешыць і здзівіць кагосьці ўмельствам вершаплецення...

Душа лірычнага героя (а ён жа — сам паэт) пратэстуе супраць насілля, жорсткасці, хцівасці, чэрствасці, якія ўсё болей запалоньваюць людзей, адбіраючы ў іх шчырасць, давер, спагаду, узаемаразуменне і ўзаемападтрымку. Паэзія заклікана дапамагчы спыніць працэс дэградацыі чалавека ў чалавеку.

Паэт б'е ў звон трывогі. Але звон гэты не аглушае гучнасцю металу. Ён без істэрычных канвульсій, без мітуслівай эстраднасці. Нервы мелодыі — агалены элекрычны провад. Там, дзе неабходна сур'ёзна думаць, разважаць, турбоцца, бяссонны званар не дазваляе сабе ладзіць «пир во время чумы» ці скакаць польку-весялуху...

Нярэдка імпэтны, энергічна-мускулісты ў радках Ігар Шклярэўскі не імкнецца прыхарошваць, ідэалізаваць сваю асобу. Ён — не ўдзельнік кастынга, дзе на подыуме намагаюцца зарабіць як мага больш балаў ад членаў журы і ўцешных ухвал прыхільных сузіральнікаў. У яго ацэнка сябе самога (і юнага, і сталага) — самакрытычная, без рэтушы:

Деревянные руки и ноги,
деревянный казённый язык
да ещё этот шарфик убогий,
а под ним, словно камень, — кадык.
Я — убожество! Ты — божество!

У героя твораў нямала прэтэнзій да самога сябе. Затое ён здольны любіць і разумець, слухаць словы і маўчанне іншых у розных абставінах — як у цалкам беларускай па геаграфіі, па быце, сялянскім укладзе жыцця (а ў многім — і па лексіцы) паэтычнай хроніцы «Жалоба счастья»:

Руки болять! Ноги болять!
Клевер скосили. Жито поспело.
Жито собрали. Сад убирать.
Глянешь, а греча уже покраснела.
Гречу убрали. Лён колотить.
Лён посушили. Сено возить.
Сено сметали. Бульбу копать.
Бульбу вскопали. Хряка смолить.
Клюкву мочить. Дрóвы пилить.
Ульи снимать. Сад утеплять.
Руки болять! Ноги болять!

Адзінаццаць радкоў. У кожным (за выключэннем адзінага — чацвёртага) па два сказы з двух слоў — назоўніка і дзеяслова. Эфект дасягаецца рэалістычнасцю і лаканізмам, дакладнай ёмістасцю ў паказе кругазвароту простых, без сенсацый, будзённых клопатаў, без якіх будуць галоднымі і генералы, і міністры, і касманаўты, і артысты...

Калі ж гаварыць пра майстэрства паэта жывапісаць, ствараць адпаведны настрой — то яно бездакорнае, з непрыхаванымі сімпатыямі да фраз пластычных, паўнаважкіх, дзе прысутнічае той магнетызм, які бярэ ў палон самім гучаннем паяднаных у цэлае чуйна выбраных слоў: «Ткётся и светится дождик грибной», «Желтеет мокрая дорога», «Снятся мне затонувшие швы...», «Закроешь глаза — подосиновик!», «Грибного детства снится мне трясина», «Вечерами таинственно-синими»... Не ў кожнага сустрэнеш такія два сціслыя радкі, у якіх — шырокі прастор для асацыяцый і багатая меладычная гама:

Кончались летние каникулы,
и вёсла в заводи курлыкали.

Калі ў паэтычным раздзеле «Могилёвская круча» беларуская тэматыка дамінуе, то ў цыкле «Неопалимое», складзеным з сямі лаканічных эсэ, яна гаспадарыць скрозь. Нават у кароценькіх запісах з назвай «Грибное ожерелье» — непаўторны пах беларускіх грыбоў, якімі ў Пецярбургу паэт частуе карыфея філалогіі Дзмітрыя Сяргеевіча Ліхачова, даследчыка старажытнай літаратуры ўсходніх славян, ганаровага доктара многіх еўрапейскіх універсітэтаў (у тым ліку — Оксфарда, Парыжа, Эдынбурга).

Эсэістычны раздзел можна назваць своеасаблівымі лапідарнымі нататкамі (некаторыя з іх — меней за старонку). Індывідуальныя рысы, асаблівасці персанажа даюцца і сцісла, і ёміста: «...в редакцию журнала идёт и наслаждается свободой, раскуривая папиросу «Беломорканал», — Рыгор Берёзкин. В светлой кепке и в светлом плаще...». «Наслаждается» — не дзеля нейкай пабочнай рэакцыі. Бо зведаны рэпрэсіі і жах сталінскай канцлагершчыны. Спазнаны голад і здзекі. І далей — тэлеграфна-пункцірна: «Любую фальшь в поэзии он чувствовал за километр, как волк!».

Аўтар вядзе чытача па Мінску самага пачатку 60-х гадоў, знаёмячы з паэтамі старэйшага ўзросту: «Вдали видна сиятельная голова добрейшего Петра Устиновича Бровки», «А вот и синеглазый Пимен Панченко, прищурился и весь сияет, написал стихи «Мінск едзе па грыбы» — «Непагоды памяло жоўтых лісцяў намяло...». А разам са старэйшымі — ідзе з маладзейшымі: Навумам Кіслікам, Яфімам Лапушыным, Рыгорам Барадуліным, мастаком Барысам Заборавым, у якога ўсё самае значнае, па-еўрапейску шматфарбнае і з падтэкстам — яшчэ напярэдадні і тут, і ў Парыжы... Пра свайго сябра Рыгора Барадуліна, якога І. Шклярэўскі па-майстэрску перакладаў рэльефна, вобразна — у эсэ «Бородулин — это не фамилия...». Тут цэлы каскад параўнанняў: «это отзвук дыхания, отраженный ведром у колодца, — нагбом», «это метафоры, которые, как под дождем, произросли в его живучем словаре», «это озимая рожь белорусского языка». И на завяршэнне, як цвёрды вывад: «Ведь Бородулин — это навсегда».

Паэт прызнаецца ў любові гораду сваёй маладосці — сталіцы Беларусі («Ода городу Минску»): «Минск — город, полный воздуха, квадратов синевы, просветов, далягляда — выход есть, и ты его найдёшь...». А «Оперный театр на холме напоминает римский Капитолий...».

Роднаму брату прысвечана «Радуга Олега Шкляревского» — цёплы і змястоўны аповед пра аўтара неардынарных дакументальных фільмаў «Тонежскія бабы» і «Пранясі, Божа, хмару». Іх лічаць нават шэдэўрамі свайго жанру...

Арганічна ўпрыгожваюць «Ожерелье...» пераклады паэмы беларускага аўтара, прадстаўніка гуманізму эпохі Адраджэння Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра» і «Слова пра паход Ігаравы»...

І. Шклярэўскі ішоў сваім шляхам: ён не дапаўняў, не расцягваў аб'ём тэкста. Наадварот, у сваім «вольном переводе» імкнуўся да мастацкага лаканізму, не капіруючы ўвесь лексічны маштаб і не дапісваючы тое, што ў тэксце адсутнічае.

Пераклад «Слова пра паход Ігаравы» на сучасную рускую мову І. Шклярэўскім акадэмік Дз. Ліхачоў лічыў адным з найлепшых і ў мастацкіх адносінах, і ў адпаведнасці яго рэаліям даўніх часоў: фальклорна-песенным традыцыям, дэталям побыту, этнаграфічным адзнакам, воінскай атрыбутыцы... У рукапісе вялікага твора маюцца мясціны, якія па-рознаму ўспрымаюцца і сёння. Ёсць, напрыклад, назоўнік «бель». У перакладзе Янкі Купалы «бель» — «белка». І гэтая вавёрка скача не толькі ў Купалы: «Дань берут по белке со двора» (у Заболоцкага), так і ў некаторых іншых аўтараў. Рыгор Барадулін пакінуў незнаёмае для яго некранутым: «...з двара па белі даніну бралі». Ігар Шклярэўскі дае сваю версію: «...и по белой монете дань берут со двора».

Вельмі чуйная да слова мая мама Любоў Трафімаўна словам «бель» называла маладую незамужнюю дзяўчыну. А ў беларусаў — столькі светлых і сінявокіх прыгажунь! І гэтае слова яна, хутчэй за ўсё, пераняла, узяла для свайго набытку ад роднай маці, ад мясцовых жыхароў.

Этымалагічныя карані — у сівой мінуўшчыне, якая даносіць да нас свае важкія, незамутнёныя стагоддзямі водгукі...

А беларуская зямля ўзбагаціла ўсю найноўшую рускую паэзію, як мінімум, двума па-славянску шчодрымі аўтарамі: Яраславам Васільевічам Смеляковым і Ігарам Іванавічам Шклярэўскім. З прапіскай, не абмежаванай часам.


Паэзія заўсёды ахінута ледзь чутнаю малітвай матылька і дрогка-вогненным прызнаннем бліскавіцы...

P.S. *У паэзіі і пудра на крыльцах матылёў можа быць цяжэй імшыстых валуноў.*

Тэкст друкуецца ў скароце.

Месца пахавання Даніїла Хармса

У Санкт-Пецярбургу ўстаноўлена дакладнае месца пахавання пісьменніка Даніїла Хармса. Цяпер прыхільнікі таленту літаратара могуць успамінаць пра яго на Піскароўскіх могілках — у раёне брацкіх магіл нумар 9 і 23.



Як распавёў пісьменнік, заснавальнік прэміі імя Даніїла Хармса Аляксандр Марс, пошукі праводзілі на падставе мноства архіўных дакументаў. Яшчэ 4 гады таму арганізатары прэміі высветлілі, што паэт пахаваны на Піскароўскіх могілках.

Даніїл Хармс загінуў у лютым 1942 года, падчас блакады, у псіхіятрычным аддзяленні турэмнага шпіталя ў «Крестах» на Арсенальнай набярэжнай, 7. Даследнікі вывучылі, куды нябожчыкаў вывозілі з «Крестов», і прыйшлі да высновы, што ў месяц смерці пісьменніка іх везлі менавіта на Піскароўскія могілкі. Заставалася знайсці брацкую магілу, дзе пахаваны Даніїл Хармс. Для гэтага звярнуліся ў архіў могілак, там і паведамілі, што ў пачатку лютага 1942 года пахаванні праводзіліся ў сектары брацкіх магіл нумар 9 і 23. Дакладней месца, на жаль, назваць не магчыма.

Названыя магілы размяшчаюцца направа ад цэнтральнай алеі Піскароўскіх могілак, за Вечным агнём, недалёка ад крыжа ў памяць суайчыннікаў, якія загінулі пры абароне Ленінграда.

Кнігавыдаўцу — 10 гадоў турмы

Суд горада Нінбо правінцыі Чжэцзян Усходняга Кітая асудзіў затрыманага ў КНР шведскага выдаўца і публіцыста кітайскага паходжання Гуй Міньхая да 10 гадоў пазбаўлення волі «за шпіянаж на карысць замежнай дзяржавы».

Рашэннем суда публіцыста «пазбавілі палітычных правоў на 5 гадоў». У пастанове суда адзначана, што Гуй Міньхай пагадзіўся з прысудам і заявіў, што не мае намераў абскарджваць яго, і папрасіў аднавіць яго кітайскае грамадзянства.

Шведска-кітайскі выдавец і публіцыст з Ганконга Гуй Міньхай распаўсюджваў кнігі, якія ўтрымлівалі крытыку палітычнага кіраўніцтва і кампартыі КНР. У кастрычніку 2015 года ён знік у Тайландзе, дзе адпачываў, пазней у СМІ апублікавалі інфармацыю, што ён і яшчэ чацвёра ганконгскіх выдаўцоў былі выкрадзены спецслужбамі КНР. У студзені 2016-га ў эфіры Цэнтральнага тэлебачання Кітая паказалі відэазапіс, у якім Гуй Міньхай паведаміў, што вярнуўся ў Кітай па ўласнай волі, каб адказаць за кіраванне аўтамабілем у нецвярозым стане ў снежні 2003 года, калі ў ДТЗ загінула школьніца. Ён адседзеў у турме 2 гады, у 2017-м яго вызвалілі, але не дазволілі пакідаць межы КНР. Праз 3 месяцы Міньхая зноў затрымалі, калі ён ехаў у Пекін у цягніку разам з двума шведскімі дыпламатамі.

Прадстаўнік Amnesty Internationa Патрык Пун, назваўшы прысуд «сумным», заявіў: «Гуй Міньхай асудзілі таемна, што пазбавіла яго шанцаў на справядлівае судовае разбіральніцтва».

Улады Швецыі 25 лютага выклікалі кітайскага амбасадара ў Стакгольме, каб выказаць яму пратэст з нагоды прысуду і запатрабаваць вызвалення Міньхая. Прадстаўнік шведскага МЗС адзначыў: «Урад працягвае патрабаваць вызвалення Гуй Міньхая і прадастаўлення нам доступу да нашага грамадзяніна для аказання консульскай падтрымкі». Дачка Міньхая таксама патрабуе яго вызвалення. Паводле яе слоў, ён стаў ахвярай незаконнага палітычнага пераследу.

Прэс-сакратар МЗС КНР на брыфінгу заявіў, што правы Міньхая не парушаліся і што ўлады КНР дазволяць дыпламатам са Швецыі сустрэцца з Гуй Міньхаем пасля згасання каронавіруса.

У мінулым лістападзе ПЭН-клуб Швецыі завочна ўганараваў Гуй Міньхая прэміяй імя Курта Тухольскага, пра што па нацыянальным тэлебачанні паведаміў міністр культуры і дэмакратыі Швецыі Аманда Лінд.

ПРЭМІІ

Прэмія імя Іва Андрыча

Аўтарытэтную міжнародную ўзнагароду — Прэмію імя Іва Андрыча — атрымала расійская пісьменніца Гузэль Яхіна (за раман «Дети мои»).



Урачыстае ўзнагароджванне пераможцы праходзіла па традыцыі ў Андрычградзе — «горадзе-музеі», які быў створаны пры актыўным удзеле вядомага кінарэжысёра Эміра Кустурыцы ў Вішаградзе (Рэспубліка Сербская Босніі і Герцагавіны). Інстытут імя Іва Андрыча, журы якога прысудзіла ўзнагароду расійскай пісьменніцы, таксама ўзначальвае Эмір Кустурыца.

«Мы жывем у турбулентны перыяд, калі, часам, здаецца, што мы спускаемся ў мінулае, а вялікая гісторыя пагражае паўтарыцца, — сказала Гузэль Яхіна на ўручэнні ўзнагароды. — Неабходна зноў будаваць масты, у першую чаргу масты культуры. Раман Іва Андрыча «Мост на Дрыне» завяршаецца сцэнай разбурэння моста, які праіснаваў 400 гадоў. Сёння, аднак, мост на Дрыне зноў стаіць і служыць людзям.

Гузэль Яхіна нарадзілася ў 1977 годзе ў Казані (Рэспубліка Татарстан). Да трох гадоў размаўляла толькі па-татарску. Рускую мову, на якой піша, вывучыла пазней. Жыве ў Маскве. Працавала ў сферы PR, рэкламы і маркетынга. Закончыла сцэнарны факультэт Маскоўскай школы кіно. Друкавалася ў часопісах «Нева», «Октябрь». У часопісе «Сибирские огни» выйшлі раздзелы яе дэбютнага рамана «Зулейха открывает глаза». Пасля шэрагу няўдалых спробаў самастойна знайсці выдаўца для свайго рамана Гузэль Яхіна звярнулася ў літаратурнае агенцтва. З яго дапамогай кніга ўбачыла свет і стала паспяховай. У 2015 годзе пісьменніца стала лаўрэаткай Нацыянальнай літаратурнай прэміі «Вялікая кніга», таксама яе раман быў адзначаны прэміямі «Ясная паляна» і «Кніга года». Па дадзеных на красавік 2018 года, першы раман «Зулейха открывает глаза» Гузэль Яхінай выдадзены на 20 мовах, а ўся проза пісьменніцы перакладзеная больш чым на 30 моў свету.

У 2018 годзе Гузэль Яхіна стала аўтарам «тატальнай дыктоўкі» — трох тэкстаў для розных гадзінных паясоў, названых «Утро», «День» і «Вечер», якія ўвайшлі ў раман «Дети мои». Новая кніга пісьменніцы прысвечаная жыццю выкладчыка нямецкай мовы, які жыве ў калоніі немцаў у Паволжы. Дзеянне кнігі разгортваецца ў перыяд ад Кастрычніцкай рэвалюцыі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Прэмія імя Кэрол Шылдс

Новы літаратурны прыз заснаваны для літаратарак Паўночнай Амерыкі. Галоўным крытэрыем адбору на Прэмію Кэрал Шылдс з'яўляецца гендэрная прыкмета: яе не могуць атрымаць аўтары мужчынскага полу.

За апошнія 20 гадоў толькі 6 жанчын атрымалі Нобелеўскую прэмію па літаратуры. Таксама толькі 6 пісьменніц былі ўзнагароджаны Пулітцэраўскай прэміяй за мастацкую літаратуру. Нацыянальная кніжная прэмія ЗША найбольш блізкая да парытэту — 9 жанчын-пераможцаў за два апошнія дзесяцігоддзі.

Але ў 2022 годзе будзе ўручана Прэмія Кэрал Шылдс, на якую не прэтэндуе ні адзін паўночнаамерыканскі мужчына. Арганізатары выказваюць надзею, што прыцягнуць увагу пісьменніц-жанчын, у прыватнасці, сумай, намнога большай за многія іншыя кніжныя ўзнагароды.

Некалькі гадоў таму канадская пісьменніца С'юзэн Свон правяла даследаванне, падлічыўшы аўтараў рознага полу ў мастацкай літаратуры, і была ў шоку ад вынікаў. Так яна стала сузаснавальніцай згаданай прэміі.

С'юзан Свон заявіла, што ўстаноўчая рада заўважыла абуральную неадпаведнасць: гістарычна аўтары-мужчыны ўзнагароджваліся значна часцей, чым жанчыны, нават нягледзячы на тое, што колькасць апублікаваных твораў мужчын і жанчын зраўнялася. Яна таксама адзначыла, што Вялікабрытанія мае прэстыжную жаночую прэмію за мастацкую літаратуру, у Аўстраліі ёсць прэмія «Stella», у Францыі — «La Prix Femina», а ў ЗША падобнага аналага няма.

Устаноўчая рада назвала ўзнагароду імем Кэрал Шылдс (Carol Ann Shields; 1935–2003), вядомай канадскай пісьменніцы, якая атрымала Пулітцэраўскую прэмію ў 1995 годзе за раман «Дзённікі Стоўна / The Stone Diaries», у



якім прасочваецца жыццё жанчыны на працягу аднаго стагоддзя. Кэрал Шылдс распавядала ў сваіх творах пра паўсядзённае жыццё жанчын, выдуманых і рэальных. «Яна пісала раманы, якія крытыкі-мужчыны традыцыйна лічылі б «лёгкімі», таму што яны «адбываліся» дома і апавядалі пра сямейныя адносіны», — адзначыла Свон.

Першая лаўрэатка Прэміі імя Кэрал Шылдс атрымае 150 тысяч канадскіх даляраў (каля 115 тысяч даляраў ЗША).

Прэмія імя Паўла Бажова

У Екацярынбургу ўручылі Усерасійскую літаратурную прэмію імя Паўла Бажова, ці, як яе называюць, «Бажоўку».

Прэтэндаваць на медаль, дыплом і грашовую ўзнагароду прэміі (50 тысяч расійскіх рублёў) могуць аўтары з усіх куткоў не толькі Расіі, але і з-за мяжы. Сёлета журы склала кароткі спіс з 12 кніг, якія вылучаны на перамогу ў 4-х намінацыях: «Майстар. Проза», «Майстар. Паэзія», «Майстар. Публіцыстыка» і «Карысць справы» (апошняя ўзнагарода не мае грашовага складніка).

Майстрам прозы прызналі Алега Хафізава з Тулы. Майстрам паэзіі назвалі Аляксандра Вавілава з Екацярынбурга (за зборнік «Евангелие от Люцифера»). Цікавай кнігай сезона, якая таксама атрымала ўзнагароду, назвалі «Ab ovo. Франц Кафка с самого начала» Валерыя Беланожкі з Карпінска. Фінальную ўзнагароду «Карысць справы» падзялілі паміж праектам «Белинка — 12 разделов истории» і альманахам для сямейнага чытання «Детская» ад часопіса «Урал».

У падрыхтоўцы старонкі выкарыстаны матэрыялы парталаў CNN, Iskra, novostiliteratury.ru і «The Washington Post».

Літаратурная Беларусь

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 354-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by